ЭКАСІСТЭМЫ: АДНАВІЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ 9

ШТО ВЫРАБЛЯЮЦЬ З ПЛАЗМЫ КРЫВІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. СЕРАДА № 112 (29481)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:

«Агульны аб'ём інвестыцый у індустрыяльны парк «Вялікі камень» склаў больш за $670 млн. Сёння 70 рэзідэнтаў з 13 краін свету актыўна ўкладваюць сюды свае фінансавыя рэсурсы. Аб'ём іх прамысловай вытворчасці складае Br233,5 млн. Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка ўкладвае інвестыцыі ў саму тэрыторыю парка. Што датычыцца ўкладання бюджэтных сродкаў, то наша краіна ўклала каля $31 млн. На адзін рубель укладзеных інвестыцый было прыцягнута дзевяць рублёў інфраструктурных інвестыцый пры агульнасусветнай практыцы адзін да двух».

І мы там былі!

Кулінарнае свята ў народных традыцыях

Фота Бел ТА.

Малады сыравар Лізавета КРЫВОШЫНА.

На Блакітнай крыніцы ў Слаўгарадскім раёне адбыліся адразу некалькі фестываляў — кулінарны, народнай прыпеўкі і веласіпедны

Яшчэ з раніцы на новым месце праз раку Сож, які летась адкрыў Прэзідэнт, назіраўся ажыўлены рух — народ ехаў, хто на машынах, хто на роварах, хто на аўтобусах. Самыя прадпрымальныя ўжо раскладвалі тавар на гандлёвых плошчах — тыя, дарэчы, на адлегласці ад Блакітнай крыніцы. За апошнія некалькі гадоў гэта месца, дзякуючы ініцыятыўным і прагрэсіўным людзям, палепшылася і цывілізавалася. Цяпер ніхто ўжо не рыпаркоўваецца, як раней, у двух метрах ад вады і не чэрпае з яе бітонамі — ахоўная зона! Мёдавараў і сыравараў тут можна сустрэць у любыя выхадныя, але на свята з'язджаецца яшчэ больш гаспадароў, рамеснікаў, майстроў, аматараў народных песень і традыцый. Гэтым разам сюды завіталі ўдзельнікі X рэгіянальнага фестывалю «Народная прыпеўка» і IX кулінарнага фэсту «Гаспадарчы сыр». Было весела і смачна!

ПАДАРУНКІ АД «ЗВЯЗДЫ»

Наш экіпаж у складзе начальніка Слаўгарадскага ўчастка паштовай сувязі Раісы Лысянковай, начальніка і спецыяліста гарадскога аддзялення сувязі Кацярыны Анішчанкі і Таццяны Жукавай (адпаведна) высадзіўся ў запаветным месцы яшчэ а дзявятай гадзіне раніцы. Раіса Лысянкова з веданнем справы растлумачыла, што трэба хуценька паставіць «паштовую» палатку, раскласці падарункі «Звязды» бліжэй да народа і бегчы па радах з абвесткай, што прыехалі прадстаўнікі газеты і можна ісці знаёміцца, а заадно падпісвацца і атрымліваць «звяздоўскія» прызы. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слаўгарадскага райвыканкама Галіна Купрыянцава адна з першых прыйшла павітацца. І адразу ж, не марнуючы часу, аформіла квартальную падпіску.

СТАР. 4

Я зноў выбіраю «Звязду»

ЗАХОЎВАЕ ЛЕПШАЕ І НЕ АДСТАЕ АД ЧАСУ

Генадзь ЯГОРАЎ, прэс-сакратар Віцебскай абласной грамадскай арганізацыі «Белая Русь»:

— Мне падабаецца «Звязда», газета ўсебакова раскрывае грамадска-палітычныя тэмы. У ёй багата цікавых матэрыялаў, прысвечаных краязнаўству, грунтоўна падаюцца матэрыялы пра нацыянальную культуру і мастацтва, ахову здароўя, аналітычныя артыкулы.

Спрыяе лепшаму прачытанню тое, што кожны матэрыял падаецца з жывінкай, каларытна і цікава для рознай аўдыторыі.

Нядаўна з задавальненнем адкрыў для сябе рубрыку «Храмы маёй Радзімы», у якой беларускія літаратары дзеляцца сваімі ўспамінамі, разважаннямі, паведамляюць адметныя факты пра храмы родных мясцін. Пасля прачытання міжвольна пачынаеш задумвацца пра тое, што было б цікава наведаць розныя куточкі нашай Бацькаўшчыны, убачыць іх вачыма незвычайных апавядальнікаў, зрабіць шмат адкрыццяў.

Выдатна, што «Звязда» вылучаецца добрай, густоўнай мовай, якасным беларускім словам. Узяўшы на ўзбраенне сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, газета захоўвае каштоўнасці традыцыйнай журналістыкі, што забяспечвае выданню ўстойлівую чытацкую аўдыторыю і павагу.

КАРАТКА

- **Нацбанк уводзіць у эксплуатацыю партал «Рэгістрацыя валютных дагавораў». Кантроль за аплатай праезду ў грамадскім транспарце ўзмоцняць у Мінску з 16 чэрвеня.**
- У Гомелі распрацавалі метад вызначэння аб'ёму пашкоджання лёгкіх у пацыентаў з выкліканай SARS-CoV-2 інфекцыяй.
- **У Беларусі за студзень — май выяўлена 619 новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.**
- Абласныя туры праекта «Уладар сяла» стартуюць 18 чэрвеня.
- **Жыхар Магілёўскага раёна атрымаў больш як Br1,1 тысячы штрафу за жорсткае абыходжанне з жывёлай.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Ніводнаму гораду ў Беларусі не ўдзяляецца такая ўвага, як Оршы»

Кадравае рашэнне і даручэнні Прэзідэнта падчас рабочай паездкі на Віцебшчыну

Учора кіраўнік дзяржавы наведаў Аршанскі мясакансервавы камбінат і Аршанскую фабрыку мастацкіх вырабаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Прэзідэнт адзначыў, што чакае вынікаў ад работы па развіцці Аршанскага раёна. «Да канца года якраз гэтай тэмай займемся. Вы адкажаце за кожны квадратны метр», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка чыноўнікаў падчас паездкі і падкрэсліў, што ніводнаму гораду ў Беларусі не ўдзяляецца такая ўвага, як Оршы. «У мяне ж і Гродна, і Брэст ёсць. Я сюды прыехаў — ужо папісваюць: а калі Прэзідэнт на захад завітае?» — дадаў ён.

Наведваючы мясакансервавы камбінат, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як будзе наладжаны рабочы працэс у новым цэху і што будзе са старымі вытворчымі і гаспадарчымі будынкамі. Як далажылі Прэзідэнту, іх збіраюцца зносіць, частку тэрыторыі перададуць гораду.

«Трэба разумна падысці. Перш за ўсё падумаць, патрэбна вам гэтая тэрыторыя будзе ў перспектыве або не, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Зрабіць тут, як кажуць, цукерку трэба. Цэх дзіцячага харчавання, як мне дакладвалі, добры. Пакінем моцныя памяшканні, выставім абсталяванне, калі трэба, — і выкарыстоўваць. Трэба падысці па-гаспадарску, разумна».

Новы цэх, як расказалі Прэзідэнту, будзе не проста часткай вытворчасці — пад яго дахам змесцяцца два мясакамбінаты. Па словах выканаўцы абавязкаў генеральнага дырэктара камбіната Максіма Бакурава, гэта адзіны такі праект у краіне.

Асобна Прэзідэнт запытаў пра рэалізацыю прадукцыі. Як расказаў Максім Бакураў, прадпрыемства цалкам закрывае патрэбы Беларусі ў дзіцячых кансервах. Аднак па цане і якасці цяжка канкурыраваць з прадукцыяй, напрыклад, расійскіх вытворцаў.

Заслухаўшы даклады аб развіцці прадпрыемства і перспектывах будучага цэха, Прэзідэнт папрасіў падаць яму яго папку. У ёй знаходзілася поўная інфармацыя аб будаўніцтве гэтага аб'екта. Па бягучых планах цэх хочуць здаць у лістападзе гэтага года, а першапачаткова яго плануюць увесці ў эксплуатацыю да 1 ліпеня. «Вы правалілі, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Значыць, знайсці маё рашэнне: там канкрэтна — адказныя, хто пасадамі, хто галавой за што адказвае. За невыкананне даручэння павінны адказаць асабіста».

Што стала прычынай зрыву тэрмінаў, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў кожнага з дакладчыкаў. Тут жа было прынята рашэнне прызначыць новага кіраўніка прадпрыемства — ім стане цяперашні выканаўца абавязкаў генеральнага дырэктара Максім Бакураў. «Але гэта толькі таму, што не зусім ты вінаваты ў правале гэтай будоўлі», — перадае словы Прэзідэнта яго прэс-служба.

Губернатару вобласці і віцэ-прэм'еру Аляксандру Субоціну было даручана кантраляваць правядзенне адміністрацыйных працэдур, у тым ліку прыняцце рашэнняў па тэндарах. «У спрошчаным варыянце: сёння запрасілі жадаючых — за суткі вырашылі. Каб не цягацца месяцамі», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Таксама ўчора Аляксандр Лукашэнка наведаў Аршанскую фабрыку мастацкіх вырабаў. Галоўнай тэмай візіту стаў далейшы лёс прадпрыемства. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб прапанове «Белвеста» па куплі гэтага прадпрыемства для наступнай арганізацыі на яе плошчах вытворчасці абутку. Аднак Прэзідэнт прыняў рашэнне перадаць фабрыку Аршанскаму льнокамбінату да жніўня гэтага года.

Стан спраў на фабрыцы не адпавядае ўяўленням аб сучаснай вытворчасці. Прэзідэнт даручыў у кароткія тэрміны навесці парадак на аб'екце, стварыць нармальныя ўмовы для працы людзей. «Да канца года фабрыка павінна мець прэзентабельны выгляд», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён даручыў перадаць калектыву, што да канца года зарплата будзе нармальная: «Людзі ў нас працавітыя — давай ім працу, яны будуць працаваць, і трэба ім заплаціць».

Таксама Прэзідэнт запатрабаваў найбліжэйшым часам прызначыць дырэктара фабрыкі (цяпер гэтая пасада вакантная), паабяцаў яшчэ раз асабіста наведаць прадпрыемства і праверыць, як выконваюцца яго даручэнні. Што датычыцца інтарэсаў «Белвеста», то Аляксандр Лукашэнка даручыў знайсці для прадпрыемства ўчастак, прыдатны для арганізацыі вытворчасці абутку.

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт звярнуў на захаванне працоўнага калектыву фабрыкі, дзе працуе шмат швачак. На такіх спецыялістаў на рынку працы ў Беларусі вялікі попыт. Тым больш што работнікі фабрыкі маюць навыкі работы з ільнянымі тканінамі. «Мы дрэнна працуем з лёнам. Мы робім выдатныя тканіны пры ўсіх іх недахопах, і ў свеце ўжо няма гэтых тканін. Гэта цяжкая, працаёмкая вытворчасць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што ў Беларусі робяць добрыя тканіны і вырабы з іх. «Але мала. Трэба агрэсіўней працаваць. І пандэмія — не было б шчасця, дык няшчасце дапамагло, — яна вам дапаможа, людзі будуць браць, калі мы разгорнемся», — перадае словы кіраўніка краіны яго прэс-служба.

У цэнтры ўвагі

Абарона сваёй краіны — абавязак кожнага яе грамадзяніна

Патрыятызм — той фактар, на якім трымаецца дзяржава. Яго выхаванне — задача не толькі сістэмы адукацыі

На выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі яго ўдзельнікі разгледзелі вельмі важную і актуальную тэму — як удасканаліць падрыхтоўку прызыўнікоў да службы ў войску ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь? Бо менавіта ў гэтым бачыцца важны фактар умацавання абароназдольнасці ва ўмовах сучасных выклікаў і пагроз.

Фота БелТА.

Мір і спакой — самае важнае

Гутарка на дадзеную тэму прайшла на базе 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай Рагачоўскай Чырванасцяжной ордэнаў Суворава і Кутузава II ступені брыгады імя Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (вайсковая часць 14147).

Як звярнула ўвагу **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** тэма сапраўды вельмі важная (яе актуальнасць складана пераацаніць): абараняць сваю дзяржаву — гэта абавязак кожнага маладога чалавека. І асабліва важна разумець, наколькі самі маладыя людзі сёння ўсведамляюць, што абарона Радзімы — гэта рэальная задача, доўг, асабліва калі ў свеце неспакойна. Аднак пакуль ёсць прабелы ў такой рабоце, хоць і выбудавана эфектыўная сістэма, падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

— Гэта сур'ёзнае пытанне, да якога мы ўсе павінны адносіцца нераўнадушна. У гэтай рабоце не павінна быць фармалізму. Сумленна, адкрыта, прыстойна, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Наша задача — агульнымі намаганнямі зрабіць усё магчымае, каб маладое пакаленне разумела: ніхто не абароніць краіну, яе незалежнасць, мір, акрамя нас саміх. І гэта не напышлівыя словы. У войска павінны ісці маральна падрыхтаваныя, фізічна моцныя юнакі. Усе павінны разумець, што будучае нашай краіны залежыць ад нас.

Яна запрасіла далучыцца да гутаркі ўсе зацікаўленыя бакі: кіраўнікоў Мінабароны, Мінадукацыі, Міністэрства аховы здароўя і іншых ведамстваў з той мэтай, каб акрэсліць праблемна-тэматычнае поле і вызначыць, што яшчэ неабходна зрабіць дзеля таго, каб работа па патрыятычным выхаванні моладзі была больш эфектыўная, рацыянальная і пабудаваная ў правільным кірунку.

Як расказаў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** у краіне зараз дзейнічае сістэма патрыятычнага выхавання моладзі: ва ўстановах адукацыі функцыянуюць 99 ваенна-патрыятычных класаў, у якіх навучаюцца 1800 дзяцей, штогод дзейнічаюць 22 спартыўна-патрыятычныя летнікі, дзе праходзіць аздараўленне больш за дзве тысячы школьнікаў (дарэчы, за пяць гадоў у 723-х профільных летніках аздаравілася больш за 50 тысяч навучэнцаў), 53 цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Але гэтага недастаткова, пераканаў міністр. Як паказаў сёлетні вясновы прызыў, запатрабаванасць у папаўненні была задаволена на 49 %, пры гэтым 41 % грамадзян, якія падлягаюць прызыву, мелі адтэрміноўку ад службы ў войску.

Трэба адзначыць, што на колькасць прызыўнікоў, безумоўна, уплывае і здароўе юнакоў.

Як расказаў **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** у сістэме былі перагледжаны некаторыя падыходы па прызнанні прыгоднымі для службы ў войску юнакоў (але так, каб не пагаршалася абараназдольнасць арміі). Аднак гэта не надта паўплывала на рост колькасці навабранцаў. У 2020-м прыгоднымі былі прызнаны 62,9 % маладых людзей (рост 0,4 % у параўнанні з 2019-м), непрыгоднымі — 19,8 % (зніжэнне на 1,4 %). Асноўныя прычыны: прыроджаныя анамаліі, праблемы з пазваночнікам, сардэчна-сасудзістай сістэмай. Шмат юнакоў з бранхіяльнай астмай, цукровым дыябетам. Дарэчы, многія з гэтых праблем фарміруюцца ў школе: з першай групай здароўя яе заканчваюць толькі 10 % выпускнікоў, з другой — 70 %. Важна, лічыць міністр, фарміраваць свядомыя здароўезберагальныя паводзіны ў сучасных школьнікаў.

Школа павінна не толькі вучыць, але і выхоўваць

Віктар Хрэнін, сярод іншых, бачыць праблему зніжэння цікавасці юнакоў да свайго абавязку па службе ў войску, у тым ліку ў сувязі з тым, што не заўсёды колькасць праведзеных мерапрыемстваў у сістэме адукацыі перарастае ў якасць, і моладзь часта пераканана, што абараняць дзяржаву павінен нехта іншы, а не яны. Аднак трэнд на кантрактную армію не адпавядае сучасным умовам. Ён растлумачыў, што ў сучаснай арміі дастаткова колькасць «кантрактнікаў» (у мірны час яна складае 65 %), аднак ці здольнае войска будзе адэкватна абараніць краіну, яе свабоду і незалежнасць ад выклікаў і пагроз у ваенны час са зброяй у руках? У гэтым, акрамя іншага, заключаецца патрыятызм. Таму важна ўзняць на больш высокі ўзровень у свядомасці маладых людзей такія паняцці, як абарона Айчыны, краіны і сям'і.

Цікавыя лічбы прывёў **часова выконваючы абавязкі міністра ўнутраных спраў Юрый НАЗАРАНКА,** які расказаў, што сёлета ад ваенных камісараў у органы ўнутраных спраў было накіравана каля пяці тысяч зваротаў аб ухіленні ад прызыву і трох тысяч зваротаў аб прыводзе прызыўнікоў па адміністрацыйных працэсах. І тут трэба нагадаць, што ўзнікае не толькі адміністрацыйная адказнасць, але і крымінальная. З пачатку года ўзбуджана 255 крымінальных спраў у дачыненні да тых, хто ўхіляецца ад службы ў войску.

Безумоўна, з боку дзяржавы неабходна прымаць адпаведныя крокі па вырашэнні праблемы ў нежаданні моладзі служыць і абараняць сваю Айчыну.

Міністр абароны Віктар Хрэнін бачыць выхад у кардынальнай змене падыходаў у фарміраванні патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення ў сістэме адукацыі: інстытут ваенрукоў, які існаваў яшчэ ў савецкай школе, неабходна вярнуць у сучасны выхаваўчы працэс. Для гэтага можна задзейнічаць «армію» былых вайскоўцаў — сёння колькасць ваенных пенсіянераў дазваляе задаволіць патрэбу ў такіх кадрах усіх установаў агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне.

Акрамя таго, як адзначыў міністр абароны, на фарміраванне патрыятызму павінен працаваць Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання, які сфарміраваны не так даўно пад патранатам Міністэрства абароны на базе Брэсцкай крэпасці (Кобрынскага форта), дзе штогод змогуць атрымліваць веды аб ваеннай гісторыі школьнікі з 5 да 9 класа з усёй краіны ў рамках профільнага летніка, а не толькі экскурсійнай дзейнасці выхаднога дня, якая сёння прысутнічае ў выхаваўчым працэсе.

У школах з'явяцца профільныя спецыялісты

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі, паведаміў, што сёння ў сістэме адукацыі працуюць 1579 настаўнікаў ваеннай падрыхтоўкі, аднак 244 чалавекі з іх (15 %) ніколі не мелі ніякіх адносін да службы ў войску. Добра, калі дадзеную функцыю выконваюць настаўнікі працоўнага навучання, але ёсць і іншыя прыклады.

Таму кіраўнік ведамства анансаваў з'яўленне з 1 верасня бягучага года новых спецыялістаў у школах — кіраўнікоў ваенна-патрыятычнага выхавання. У прыватнасці, амаль дзве тысячы ставак было вылучана Міністэрствам адукацыі з існуючага бюджэту на згаданыя мэты.

Трэба падабраць кваліфікаваных спецыялістаў на такія вакансіі, пераканана Наталля Качанава, ад гэтага будзе залежаць будучае маладога пакалення і іх жаданне служыць у войску ў далейшым. Ваенныя камісары рэгіёнаў, якія бралі ўдзел у выязным пасяджэнні, падключацца да названай работы.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЭТА — ПАЦВЕРДЗІЦЬ СПАРТЫЎНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Беларусы-параалімпійцы рыхтуюцца да стартаў у Токіа

Да пачатку Параалімпійскіх гульняў у Токіа засталося крыху больш за месяц. Галоўныя старты для спартсменаў з асаблівасцямі здароўя адбудуцца адразу пасля Алімпійскіх гульняў — з 24 жніўня да 5 верасня. Як да гэтых Гульняў рыхтуюцца беларусы і з якімі праблемамі прыйдзецца сутыкнуцца, журналістам на прэс-канферэнцыі расказалі першы сакратар Нацыянальнага параалімпійскага камітэта Мікалай ШУДЗЕЙКА, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па інваспорту Ігар ЛАПШЫН, старшы трэнер нацыянальнай каманды па плаванні Генадзь ВІШНЯКОЎ і шматразовы чэмпіён Параалімпійскіх гульняў па плаванні Ігар БОКІЙ.

Параалімпійскія гульні, таксама як і Алімпійскія, будуць праходзіць з выкарыстаннем жорсткіх эпідэміялагічных мер. Напрыклад, праз пандэмію каранавіруса на спартыўных аб'ектах Токіа не праводзіліся тэставыя спаборніцтвы. Падчас форуму спартсмены і члены дэлегацыі павінны будуць пастаянна даваць інфармацыю аб сваіх перамяшчэннях і стане здароўя ў спецыяльным мабільным дадатку. «Становяцца больш жорсткімі непасрэдна прафілактычныя мерапрыемствы. Пакуль у нас такая ўстаноўка, што кожны дзень спартсмены будуць праходзіць па 2-3 тэсты на каранавірус. Гэта можа быць цяжка з псіхалагічнага боку для атлетаў, бо ўсякае можа здарыцца. Але ўсе ў роўных умовах, да ўсіх прад'яўляюцца аднолькавыя патрабаванні. Таму будзем усё выконваць і спадзявацца, што ўсё будзе добра», — сказаў Мікалай Шудзейка.

Дырэктар РЦАП па інваспорце Ігар Лапшын падкрэсліў, што сёння амаль усе арганізацыйныя пытанні па выступленні беларусаў у Токіа вырашаны. Пакуль складанасці ўзнікаюць толькі з пытаннямі дарогі да алімпійскай і параалімпійскай сталіцы і адтуль дадому.

На сёння беларускія параалімпійцы маюць ліцэнзіі на Гульні ў чатырох відах спорту: чатыры ў лёгкай атлетыцы, па адной ліцэнзіі ў веславанні на байдарках і каноэ і ў акадэмічным веславанні, дзве ліцэнзіі ў фехтаванні (у гэтым відзе запланавана яшчэ адна ліцэнзія). На кваліфікацыйным турніры за ліцэнзію зараз змагаюцца і дзюдаісты.

Максімальную колькасць пуцёвак у Токіа атрымалі плыўцы — 11 ліцэнзій. Своеасаблівы рэкорд яны ўстанавілі на нядаўнім чэмпіянаце Еўропы ў Партугаліі: беларусы заваявалі 19 медалёў. Па словах Генадзя Вішнякова, пасля такога паспяховага выступлення на кантынентальным першынстве каманда сур'ёзна нацэлена на падрыхтоўку да галоўных стартаў і на выдатнае выступленне. Асноўныя медальныя надзеі ўскладваюцца на найлепшага беларускага параалімпійца Ігара Бокія.

«Дасягнуць высокага выніку складана, але яшчэ складаней яго вытрымаць. У мяне хвалявання няма. Зараз ідзе сур'ёзны трэніровачны працэс. На Гульнях канкурэнцыя будзе на кожнай дыстанцыі. Кожны спартсмен мацны ў сваёй катэгорыі. Будзем рыхтавацца, працаваць на максімальны вынік і будзем змагацца з усімі. Якая ў мяне любімая дыстанцыя? Мабыць, няма такой. Я проста люблю гэты спаборніцкі працэс, заплывы. Няважна, якім стылем плыву, галоўнае — барацьба, азарт. Гэта дапамагае. Я імкнуся да паляпшэння свайго выніку. Стараюся на кожным турніры біць свае рэкорды, хацелася б гэта рабіць на кожнай дыстанцыі, але не заўсёды атрымліваецца трымаць такую форму. Але імкнуцца паляпшаць свой час — гэта галоўнае».

Уся беларуская каманда на Параалімпійскія гульні — гэта сімбіёз маладосці і вопыту. Самы малады спартсмен — 15-гадовы плывец Уладзімір Сотнікаў. Як падкрэсліў Мікалай Шудзейка, ён — будучыня беларускага параалімпійскага плавання. «Ігар Бокій — сярэдняе пакаленне, але на яго ўсе раўняюцца дзякуючы яго дасягненням. У плаванні могуць задаць тон і Дзмітрый Салей, і Уладзімір Ізотаў, гэта людзі, ад якіх мы чакаем медалёў. У лёгкай атлетыцы Сяргей Бурдукоў лічыцца ветэранам. Людміла Волчак таксама на Гульні адабралася. На гэтых людзей мы разлічваем, на іх будуць глядзець маладыя спартсмены і браць з іх прыклад. Сплаў маладосці і вопыту павінен даць свае вынікі», — расказаў генеральны сакратар Нацыянальнага параалімпійскага камітэта.

Галоўная мэта беларускай параалімпійскай каманды — выступіць не горш, чым на папярэдніх Параалімпійскіх гульнях. Як адзначыў Мікалай Шудзейка, 10—12 медалёў будзе добрым вынікам для беларускіх спартсменаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

Будзь у курсе!

Урад змяніў правілы пасажырскіх чыгуначных перавозак

У прыватнасці, цяпер перавозчык можа вызначаць ільготныя катэгорыі пасажыраў для зніжак на паслугі транспартных чыгуначных тэрміналаў. Ці ж паслугі могуць быць бясплатнымі. Пры афармленні льготнага білета ў ім указваецца прозвішча пасажыра і нумар дакумента на зніжку.

Таксама ў новых правілах замацаваны прыярытэт нізкіх месцаў для інвалідаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, а таксама для пасажыраў пенсійнага ўзросту, пасажыраў з дзецьмі да 10 гадоў.

Дазволена пераафармленне білета для разавай паездкі ў цягніку рэгіянальных ліній эканом-класа (звычайныя дызелі і электрычкі) на квіток для гарадскіх ліній (новы тып электрычак).

Пры пасадцы ў цягнік міжнародных ліній прад'яўляецца дакумент, які сведчыць асобу, на імя і прозвішча, названыя ў білеце. Калі гэтыя даныя ў білеце не адпавядаюць даным у дакументе, але ёсць іншы дакумент, які пацвярджае факт іх змянення, то такі пасажыр дапускаецца ў вагон. Калі ж ёсць разыходжанне больш чым на дзве літары і няма ніякага пацвярджальнага дакумента, як у першым выпадку, пасажыра не пусцяць.

Новаўвядзенні ўступаюць у сілу з 16 чэрвеня.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Аскар БЕЙСЕНБАЕЎ:

«З марай пра мір, дабрыню і шчасце»

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла прэзентацыя літаратурна-мастацкага альманаха «Казахстан — Беларусь». Выданне з'явілася на свет дзякуючы плённаму супрацоўніцтву пісьменнікаў дзвюх краін на працягу некалькіх апошніх гадоў.

Сярод ганаровых удзельнікаў сапраўды святочнай імпрэзы быў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан Аскар БЕЙСЕНБАЕЎ. Дарэчы, ён выступіў і з прадмовай, якая адкрывае альманах, выдадзены ў Алматы на трох мовах — казахскай, беларускай і рускай. Вось што, у прыватнасці, заўважыў спадар пасол: «Вы трымаеце ў руках першы том альманаха «Казахстан — Беларусь», якія ўвабраў у сябе мудрасць, сілу і прыгажосць слоў, якія гучаць на трох мовах — казахскай, беларускай і рускай. На мовах еўразійскай прасторы, багатай гісторыяй, адзначанай самабытнасцю культур, якія захоўваюць спадчыну вялікіх майстроў мастацкага слова, якое выпеставала не адно пакаленне таленавітых паэтаў, празаікаў, драматургаў.

Невыпадкова яго адкрывае вялікі казахскі паэт, філосаф, Настаўнік — Абай Кунанбаеў, чый 175-гадовы юбілей сёлета (размова пра 2020 год, напрыканцы якога выйшаў альманах. — **М. Б.**) шырока адзначаецца ў свеце. Абай завяшчаў будучым пакаленням сваю мудрасць у «Кнізе слоў», паэмах, лірыцы. Ён упершыню пераклаў на казахскую мову творы геніяў, паэтаў-рэфарматараў рускага пісьменства — А. Пушкіна і М. Лермантава». Ён сам стаў рэфарматарам казахскай мовы, казахскай душы, казахскага грамадства. Яго творы перакладзены на 116 моў народаў свету. Мікола Мятліцкі сваімі перакладамі Абая на беларускую мову парадніў нашы народы». І вось што яшчэ дадаў Аскар Бейсенбаеў: «Тэрмін «альманах» мае на ўвазе працяг і перыядычнасць, а значыць, у гэтага выдання павінна быць будучыня. І не столькі тып выдання дыктуе гэтую заканамернасць, і нават не велізарнае багацце нашых літаратур, якое яшчэ не адкрыта чытачамі нашых дзяржаў, колькі патрэба нашых народаў быць бліжэйшымі, разглядаць агульнае ў розным, улаўліваць вібрацыю пачуццяў у моўных фарбах і разам рухацца да мары, якая аб'ядноўвае аўтараў фаліянта. Мары пра мір, дабрыню і шчасце».

Сваімі развагамі пра альманах, ініцыятыву нараджэння якога падтрымала Міністэрства культуры і спорту Рэспублікі Казахстан, над стварэннем якога рупіліся ў Саюзе пісьменнікаў Казахстана, Саюзе пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкім доме «Звязда», на прэзентацыі падзяліліся лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь перакладчык Абая Мікола Мятліцкі, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі доктар філалагічных навук Іван Саверчанка, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі перакладчык рамана Мухтара Аўзава, прысвечанага Абаю, Міхась Пазнякоў, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава... Кожны знайшоў свае словы, якія сведчылі пра цеснае гуманітарнае, культурнае супрацоўніцтва Беларусі і Казахстана. Пра гэта гаварылася і ў прывітальным слове ад імя міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатоля Маркевіча.

З Казахстана на прэзентацыю прыляцела намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Простор», паэтэса, публіцыст Любоў Шашкова, ураджэнка Беларусі. У альманаху, дарэчы, змешчаны ўрывак з яе паэмы «Рагнеда». Таксама ў фармаце анлайн удзел у прадстаўленні альманаха беларускім чытачам прынялі пісьменнікі, літаратуразнаўцы Казахстана — Арынбай Жанайдараў, Святлана Ананьева, Бахытжан Канап'янаў...

На старонках альманаха «Казахстан — Беларусь» з беларускага боку выступілі Алена Стэльмах, Алена Мальчэўская, Алесь Бадак, Віктар Шніп, Марыя Кобец, Віктар Гардзей, Андрэй Федарэнка, Людміла Рублеўская, Таццяна Сівец, Мікалай Аляксандраў, Мікола Мятліцкі, Міхась Пазнякоў, Васіль Ткачоў, Валерый Казакоў, Іван Арабейка, Генадзь Аўласенка, іншыя паэты, празаікі. Несумненна, плён кожнага з іх і ў перакладчыцкай працы, і ў арыгінальнай мастацкай творчасці звязаны з сяброўствам, трывалымі стасункамі з братнім Казахстанам. І, канешне ж, беларуская літаратурная грамадскасць не можа не паспрыяць нараджэнню ўжо новага выпуску альманаха пад назвай «Беларусь — Казахстан».

Мікола БЕРЛЕЖ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Жэневе пройдуць перагаворы Пуціна і Байдэна

Напярэдадні памочнік прэзідэнта Расіі Юрый Ушакоў распавёў, як пройдзе першая сустрэча Уладзіміра Пуціна і Джо Байдэна ў якасці лідараў сваіх краін, паведаміла ТАСС. Саміт Расія — ЗША адбудзецца 16 чэрвеня. Сустрэча пачнецца на віле Ла Гранж. «Гэтая віла актыўна выкарыстоўваецца камунальнымі ўладамі Жэневы і федэральным урадам», — удакладніў Ушакоў. «Парадак дня — практычна ўсе тэмы, якія зараз хвалююць і нас, і амерыканскі бок, — адзначыў Ушакоў. Пры гэтым ён падкрэсліў, што стратэгічная стабільнасць стане адной з ключавых тэм саміту. «Адносіны Расіі і ЗША доўгія гады дэградавалі і знаходзяцца цяпер у нездавальняльным стане», — сказаў Ушакоў, адзначыўшы, што нармалізацыя ў гэтай сферы аднолькава патрэбна абодвум бакам. Тэма Беларусі, заўважыў памочнік расійскага прэзідэнта, таксама можа быць закранута падчас сустрэчы. «Я не выключаю, што амерыканцы гэтую тэму закрануць. Тым больш яны абмеркавалі гэта ўсё з саюзнікамі — у натаўскім коле, еэсаўскім», — сказаў ён. Саміт працягнецца чатыры-пяць гадзін з перапынкамі і зменамі фарматаў, заявіў прэс-сакратар расійскага лідара Дзмітрый Пяскоў. Пасля гэтага кожны бок правядзе асобную прэс-канферэнцыю.

Кітай стварыў механізм жорсткага адказу на санкцыі Захаду

Заканадаўства КНР папоўнілася яшчэ адным законам. Ён накіраваны на барацьбу з амерыканскімі і еўрапейскімі санкцыямі супраць Кітая. Урад КНР атрымаў права ўводзіць контрсанкцыі супраць замежных грамадзян, кампаній і арганізацый, якія аказваюць на Пекін ціск пры дапамозе «дыскрымінацыйных абмежаванняў», паведаміў expert.ru. Сярод мер у адказ, якія дазволена выкарыстоўваць кітайскім уладам, — права адмаўляць у выдачы віз або ануляваць іх, канфіскоўваць і замарожваць рахункі і актывы на тэрыторыі Кітая, блакіраваць транзакцыі і супрацоўніцтва з грамадзянамі КНР і кітайскімі арганізацыямі і фірмамі, а таксама на правядзенне іншых, не названых у законе «неабходных мер». Новы закон дае Пекіну права ўводзіць меры ў адказ не толькі супраць фізічных асоб і арганізацый, адказных за прыняцце антыкітайскіх санкцый, але і супраць, напрыклад, іх мужа і жонкі або блізкіх сваякоў, а таксама арганізацый, калі імі кіруе чалавек, які трапляе пад дзеянне контрсанкцый. У чорны спіс можа быць уключаны і найвышэйшы персанал такіх кампаній і арганізацый.

Граніцу паміж Паўднёвай Карэяй і КНДР будуць абараняць робаты

Рэспубліка Карэя разгорне ў раёне граніцы з КНДР робатаў, аснашчаных самымі сучаснымі датчыкамі і штучным інтэлектам. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае агенцтва абаронных закупак (DAPA) Паўднёвай Карэі. Паводле яго даных, першых двух робатаў-пагранічнікаў коштам $2,5 мільёна плануецца размясціць з паўднёвага боку дэмілітарызаванай зоны ў кастрычніку гэтага года. На працягу трох месяцаў яны будуць працаваць у пілотным рэжыме, пасля чаго будзе прынята рашэнне аб іх масавым выкарыстанні. Паведамляецца, што робаты будуць перамяшчацца па спецыяльных рэйках з хуткасцю да пяці метраў у секунду і несці дзяжурства кругласутачна. Прылады абсталяваны нахільна-паваротнай камерай высокай якасці і сучаснымі сэнсарамі. Штучны інтэлект робата будзе самастойна аналізаваць гукі і малюнак з камеры і апавяшчаць аператараў у выпадку выяўлення падазронай актыўнасці. Сістэма здольная да саманавучання, і чакаецца, што з цягам часу яе работа будзе станавіцца больш эфектыўнай.

АД ЗЯМЛІ І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Пра пытанне, прадыктаванае жыццём, беларусы кажуць — «ад зямлі». Такім у Падзвінні называюць прэзідэнцкі Указ «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці» (ад 25 лютага 2020 года № 70). Праз яго на ўзроўні кіраўніцтва краіны развіццю галіны былі дадзены новыя імпульс і магчымасці. Якія папярэднія вынікі? І як справы ў фермераў, на якіх не распаўсюджваюцца ўмовы дакумента?

«АД ПОЛЯ ДА ПРЫЛАЎКА»

Указам прадугледжаны комплекс прэферэнцый і не толькі. У прыватнасці, адтэрміноўка па выплаце крэдытаў, магчымасць службы ў войску ў рэзерве для рабочых і служачых, неабходных на вёсцы. Маюцца і розныя эканамічныя стымулы.

Каб не распыляцца ў выдатках, акумуляваць намаганні, стварылі сем буйных аграпрамысловых холдынгаў на базе магутных у эканамічным плане прадпрыемстваў: Віцебскі мясакамбінат, Аршанскі мясаканцервавы камбінат, Пастаўскі малочны завод, Глыбоцкі малочнаканцервавы камбінат, Полацкі малочны камбінат, ААТ «Малако» (г. Віцебск), Верхнядзвінскі масласырзавод.

Сельскагаспадарчыя аб'яднанні дазваляюць эфектыўна кіраваць фінансамі, весці работу з кадрамі, купляць оптам сельскагаспадарчую тэхніку і ўгнаенні, прадаваць канчатковую прадукцыю, у тым ліку на экспарт.

Прынцып «ад поля да прылаўка» часта згадвае **старшыня Віцебскага абласнога выканкама Мікалай ШАРСНЁЎ.** Задача пастаўлена: пры мінімуме выдаткаў і моцнай кадравай палітыцы дасягнуць максімальных вытворчых вынікаў. Нядаўна кіраўнік рэгіёна падзяліўся з журналістамі нагодай для аптымізму: прадукцыя рэалізуецца паспяхова, сяляне адчулі добрыя змены. І нават гарадскія хлопцы і дзяўчаты пасля заканчэння сельскагаспадарчай ВНУ хочуць размеркавання ў глыбінцы, бо прыцягваюць высокія заробкі, магчымасць атрымаць уласнае жыллё, а ўмовы ў аграгарадках — на ўзроўні гарадскіх.

ВОПЫТ БУДУЦЬ ПЕРАЙМАЦЬ

З тым, як рэалізоўваюцца пункты ўказа на месцы, рэгулярна знаёміцца **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Іван КРУПКО.** Апошнім часам ён двойчы пабываў на Віцебшчыне. Падчас камандзіровкі ў Глыбоцкі раён агледзеў аб'екты жывёлагадоўлі. У холдынгу, лакаматывам якога стаў Глыбоцкі малочнаканцервавы камбінат, рамонтныя і будаўнічыя работы вядуцца ў дваццаці месцах. У аб'яднанне ўвайшлі дваццаць тры гаспадаркі. Колькасць фермаў павінна адпавядаць лагістычным параметрам, каб аптымізаваць працэсы кармлення.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс ЯФРЭМАЎ агучыў ідэю стварэння памяткі для кіраўніка кожнай гаспадаркі. Каб яны разумелі, чаго канкрэтна ад іх чакаюць у вызначаны тэрмін, падлічвалі выдаткі і памер выручкі і пры неабходнасці нарошчвалі аб'ёмы, высвятлялі, што зроблена не так. Адным словам, рабілі работу над памылкамі.

А ЯК СПРАВЫ Ў ФЕРМЕРАЎ?

Паводле інфармацыі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці, у Падзвінні на пачатак бягучага года налічвалася 417 дзеючых сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. За апошнія дзесяць гадоў іх колькасць павялічылася на 36, або на 9 %.

У іх карыстанні знаходзіцца каля 42 тысяч гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку ворных — амаль 26 тысяч гектараў. У параўнанні з 2010 годам землі, якія займаюць фермерскія гаспадаркі, павялічыліся ў два разы, амаль на столькі ж — ворныя.

Аб'ём вытворчасці прадукцыі фермераў за 10 гадоў павялічыўся ў супастаўных цэнах удвая, прадукцыі раслінаводства — утрая. У жывёлагадоўлі вытворчасць знізілася — амаль на 30 %. Дарэчы, у агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі на долю фермерскіх гаспадарак прыпадае нязначная частка.

Пры гэтым узрасла доля фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі. Летась яна склала 1,2 % (у 2010 годзе — 0,6 %).

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Кулінарнае свята...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я ж актыўная чытачка «Звязды», — прызналася яна. — На яе старонках падымаюцца актуальныя пытанні, вельмі важныя для ўсёй Беларусі. Можна даведацца, якія дзе адбываюцца мерапрыемствы. Нехта вось пачытае і пра нашы святы, а наступным разам, магчыма, і прыедзе.

Для выдання вельмі важна, каб у яго былі вось такія ўсім сэрцам адданыя чытачы. Для іх мы і працуем. А наша «звяздоўская» фуфайка стала для падпісчыцы прыемным сюрпрызам.

— У нас ёсць падпісчыкі, якія без «Звязды» жыць не могуць, — запэўнівае **начальнік Слаўгарадскага ўчастка паштовай сувязі Раіса ЛЫСЯНКОВА.** — Як толькі паштальён крыху затрымаецца, ужо тэлефануюць: дзе газета? Некаторыя чытаюць яе ўжо больш як 30 гадоў. Шукаем і новых падпісчыкаў. І такія вось святы — вельмі добрая для гэтага падстава. А яшчэ будучых сяброў «Звязды» знаходзяць нашы паштальёны і распаўсюджвальнікі. Апошнія працуюць на вядучых раённых прадпрыемствах. Цяпер падпіска ідзе штомесячная. Людзям так прасцей і танней.

Яшчэ адна наша падпісчыца адшукалася сярод сыравару. «Звязда» таксама ўручыла ёй прыз за вернасць. А яна пачаставала сваімі вырабамі. М-м-м, якія ж яны смачныя!..

— А сыр, падпечаны на патэльні, спрабавалі? — пытаецца яна.

Цікава, што за навінка? І рука ўжо сама цягнецца па кашалёк. Вока ж, як той казаў, адпачывае на ўсіх гэтых рыкотах, качотах, халумінах і іншых сырах з не менш гучнымі назвамі. З прыправамі, духмянымі травамі, разынкамі, шакаладам, цукатамі — усё такое апетытнае, прыгожае... Дарэчы, сыры слаўгарадскіх сыравараў вельмі любяць італьянцы. Тыя разбіраюцца ў падобных стравах.

У НАРОДНАГА СВЯТА — СПАРТЫЎНЫ ДУХ

Зранку каля галоўнай сцэны збіраецца група на роварах: арганізатары вырашылі ў рамках кулінарнага фэсту правесці яшчэ і велафестываль. Дзеля яго асноўная частка ўдзельнікаў пераадолела больш за 10 кіламетраў ад Слаўгарада да Блакітнай крыніцы. Што ні зробіш, каб прадэманстраваць спартыўны дух?!

— Я пастаянны ўдзельнік велапрабегаў па памятных мясцінах, — кажа **68-гадовы Аляксандр Іванавіч МАЛЯНКОЎ.** — Гэтым разам едзем па запаведных засожскіх мясцінах — да Чорнага возера, што каля Дубны, і назад.

Перад стартам веласіпедысты становяцца на флэшмоб каля вялікага дзяржаўнага сцяга і фатаграфуюцца на памяць.

— Нядаўна стартаваў рэспубліканскі праект «Роднае — народнае», і мы падтрымліваем яго, — заўважае **сакратар слаўгарадскай арганізацыі БРСМ Вікторыя ГАРАДЗЕЦКАЯ.** — Наогул, такія фэсты, як сённяшні — сапраўднае натхненне для моладзі.

Таццяна ГУРЫНА *(з дыпломам)* з каляжанкамі па «сырным» руху.

Арганізатары велафестывалю закліканаюць гасцей удзяліць крыху ўвагі і спартыўна-забаўляльнай пляцоўцы, што размясцілася на карце свята. Там можна было зарабіць бонусы і атрымаць за актыўнасць падарунак.

З ЖАРТАМІ ДЫ МУЗЫКАЙ

— Даражэнькія нашы, рады вас усіх бачыць, — вітае гасцей у мікрафон мужчына ў народным строі і саламяным капелюшы і звяртаецца да суседкі па сцэне. — І табе, добры дзень, Кума. Прыбралася, расфуфырылася — куды намылілася? Замуж сабралася? Або кароўка стала даіцца? А можа, у артысткі вырашыла падацца і ў кіно пра вампіраў без грыму здымацца? — кпіць Кум і працягвае «здзекавацца». — Што маўчыш, як язык з'ела? Кажы, у чым справа?

У Кумы ад такога пасажу нібы дыханне перахапіла: «Так я табе і прызналася! Не твая справа — навошта і куды я сабралася!»

— А можа, падкажаш, што тут у нас сёння адбываецца? — ужо міралюбіва пытаецца Кум.

— Як што? — абураецца Кума, паставіўшы рукі ў бокі. — Слаўгарадчына ў дзявяты раз прымае кулінарны фэст «Гаспадарчы сыр»!

— Дык што ж ты маўчыш, загадзя не папярэдзіш? — хапаецца за галаву Кум.

Наталля Купрэева і Яўген Аношка на беларускай мове з задзірыстымі ноткамі разыгрываюць сапраўднае прадстаўленне і з першых хвілін зараджаюць публіку на добры настрой. На свята з'ехаліся ўсе зоркі мастацкай самадзейнасці Слаўгарадскага раёна. У народных касцюмах, галасістыя, завадныя — народныя прыпеўкі ў іх выкананні гучалі над Блакітнай крыніцай два дні, не змаўкаючы. Асобна віталі слаўгарадскіх сыравараў.

— Гэта наш гонар, наш брэнд, — аб'явіла **намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Алена ШАЎЦОВА.** — Сырны фэст атрымаў пачатак у 2012 годзе, і сёння ён папулярны не толькі на Магілёўшчыне. Цяпер ён дапамагае нам развіваць гастранамічны турызм.

Перад тым, як аб'явіць адкрыццё «сырнага» фэсту, Алена Шаўцова са словамі: «Гэта каб натхніць на свята!» — уручыла ўдзельнікам спецыяльныя дыпломы.

Дарэчы, у фестывальныя дні гучалі не толькі прыпеўкі, але і вершы. Сярод гасцей, якія прыехалі на фестываль, былі літаратары з Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.

— Гэта ўжо другая сустрэча з нашымі сябрамі з клуба «Натхненне», — паднаёміла з таварышамі па пяры **старшы навуковы супрацоўнік Слаўгарадскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Вера СТАСЕНКА.** — Яны завіталі да нас на чале са старшынёй суполкі Міхасём Міронавым. Нам пашчасціла ўбачыць таксама Валянціну Несцярэнку, Васіля Зайцава, Алу Прымакову і іншых таленавітых аўтараў.

Галіна КУПРЫЯНЦАВА *(са «звяздоўскай» фуфайкай)* — пастаянная падпісчыца «Звязды». Раіса ЛЫСЯНКОВА *(у кепцы)* запрашае далучыцца.

На свяце працавала літаратурна-краязнаўчая экспазіцыя ад раённага музея, якая знаёміла з гісторыяй фестывальнага руху на Слаўгарадчыне, беларускім хатнім інтэр'ерам, стравамі і традыцыямі. Ідэя выстаўкі належыць Веры Стасенцы.

СЫРАВАРАМ — СЛАВА!

Прыемна было даведацца, што «сырны» рух на Слаўгарадчыне не толькі не слабее, але набірае моц і распаўсюджваецца на іншыя раёны Магілёўскай вобласці. Рэгіянальная ініцыятыва «На скрыжаванні густаў», якая цяпер рэалізоўваецца ў рамках праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці» і фінансуецца Еўрасаюзам, ажыццяўляецца Слаўгарадскім райвыканкамам у партнёрстве з Клічаўскім, Быхаўскім, Краснапольскім і Чэрыкаўскім райвыканкамамі і Міжнародным фондам развіцця сельскіх тэрыторый.

На свяце ўшаноўвалі і аксакалаў сырнай справы. Каля вытокаў яго стаяла Таццяна Гурына.

— Калі мы праводзілі першы фестываль, нам было нават цяжка ўявіць, што з гэтага можа нешта атрымацца, — прызналася яна карэспандэнту «Звязды». — Мы яго ўпісалі ў праект, а што рабіць, не ведалі. Гэта ўжо з вопытам прыйшло. Былі і скептыкі, якія адгаворвалі гэтым займацца, але мы не адмовіліся. Цяпер, бачыце, які ўздым. Людзям гэта стала прыносіць даход. Адна з нашых паплечніц з турфірмамі працуе, не паспявае прымаць дэлегацыі. Усе дзяўчаты маюць пастаянны даход. Гэта нялёгкая работа трымаць жывёлу і даглядаць яе. І я ганаруся, што мае калегі гэтым займаюцца. У рамках праекта «На скрыжаванні густаў» мы прыцягнулі ў сваю групу яшчэ і сыравараў з вёскі Горы Краснапольскага раёна і з Чэрыкава.

Каля палаткі сыраварай была такая чарга, што я па-добраму парадавалася за поспех суполкі. Прыемна было сустрэцца і са старымі знаёмымі. Галіна Таран заўсёды радуе смакатой з казінага малака. Гэтым разам яна пераўзышла сябе. Такога далікатнага і прыемнага на смак казінага сыру я яшчэ не спрабавала. Ён літаральна раставаў у роце! Вось што значыць ініцыятывы плюс добрая глеба для яе росту.

Сыры і прысмакі з малака і тварагу былі не адзіным пачастункам на свяце. І нават калі б вы прыехалі на яго зусім без грошай, галодныя дакладна не засталіся б! Сельскія клубы, цэнтры творчасці, садкі, бібліятэкі раёна нагатавалі столькі смакаты, пачынаючы ад каўбас і бліноў, заканчваючы бярозавікам і медавухай, што прайсці міма гэтага багацця, не пакаштаваўшы, было немагчыма. Мне, напрыклад, вельмі спадабаліся грыбкі ад Алесі Кураковай з Шаламоў, а яшчэ бярозавік ад ржаўкаўскіх кулінарак! Дзяўчаты падзяліліся рэцэптам — на тры літры соку чайная лыжка «лімонкі», цукар і апельсін, і запрасілі ў Ржаўку на майстар-клас. Абавязкова з'езджу, бо ведаю, што там жывуць сябры «Звязды». Іх наогул на гэтым свяце было шмат.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Слаўгарадскі раён.

З людзьмі і сам-насам

«Мала пасеяць разумнае, добрае, вечнае. Трэба яшчэ і бараніць яго ад лухты і хлусні»

Не вам казаць: у нашым календары багата розных свят, не менеш — памятных дат, і самая жалобная, вядома ж, вось гэта — 22 чэрвеня: сёлета — 80 гадоў ад пачатку Вялікай Айчыннай... Сыходзяць ад нас не ветэраны (на 1 мая іх заставалася 3337 чалавек), сыходзяць апошнія сведкі — тыя, хто жахі вайны перажыў у дзяцінстве. Але разам з імі не павінна сыходзіць памяць. Гэтая думка аб'ядноўвае многія лісты. На жаль, не без падстаў.

«Я нарадзіўся ў 1940-м і пра ваеннае ліхалецце помню, вядома ж, няшмат, — піша спадар **Анатоль Хлапкоў з аграгарадка Чырвоны Бераг, што на Жлобіншчыне.** *— Помню страшныя ўзрывы, ад якіх, малым, хаваўся пад печ, помню свой адчай — немцы забіралі маму на прымусовыя работы, помню пастаянны голад: калі была такая магчымасць, пасля з'едзенай бульбіны браў яшчэ адну — заесці...*

І цяпер страшна ведаць, што людзі, якія лічаць сябе разумнымі, набожнымі, адукаванымі, дзеля ўлады і грошай працягваюць выбраляць смертаносную зброю. Так і хочацца крыкнуць ім: «Спыніцеся! Адумайцеся! Не зведалі самі, дык хоць уявіце жыццё ў акопах і зямлянках, у пастаянным страху за жыццё сваіх родных і блізкіх, якіх можна болей не ўбачыць»...

Потым на змену абурэнню прыходзіць хваляванне: трэба, каб чалавецтва не забылася на тое, што ўжо перажыло. Амаль 60 гадоў пражыўшы ў Чырвоным Беразе, я не мог не зацікавіцца яго гісторыяй. Мне ўдалося сабраць матэрыялы пра лёс падпольшчыка Віктара Васільчыка — і цяпер у мястэчку ўстаўлена памятная дошка, — запісаць успаміны людзей.

За гады вайны ў нашым Чырвоным Беразе загінула 173 чалавекі, у тым ліку 112 дзяцей. Нямецкі акупацыйны парадак — гэта расстрэлы, катаванні і здзекі, гэта два разрабаваныя і разгромленыя заводы, пяць калгасаў, два саўгасы, сельгастэхнікум, гэта 112 спаленых будынкаў, у тым ліку трох школ, бібліятэкі, клуба.

Па ўспамінах сведак, перамяшчацца дазвалялася толькі па пропусках. Школы не працавалі. Медустановы былі зачынены. Калгасных кароў і коней на зіму раздалі насельніцтву, але малако трэба было здаваць акупантам. Людзей штодзень з нагайкамі зганялі на прымусовыя работы.

І нават пры гэтым немцы штовечар абыходзілі падворкі, зазіралі ва ўсе куты, правяралі, ці не сышоў хто ў партызаны...»

Факт агульна- і сумнавядомы, але ж, як успамінае спадар Хлапкоў, за тры гады акупацыі фашысты стварылі ў Чырвоным Беразе два лагеры. У той, што на тэрыторыі ваеннай часці, з найбліжэйшых раёнаў звозілі ваеннапалонных і асоб працаздольнага ўзросту. Сярод іх быў і бацька спадара Анатоля, які потым расказваў, што немцы кожны дзень строілі вязняў у шарэнгі, і кожны пяты альбо дзясяты атрымліваў удар, ад якога доўгі час мог ляжаць без прытомнасці...

«Другі лагер размяшчаўся на тэрыторыі сядзібы Козел-Паклеўскіх і быў для дзяцей. Іх, ва ўзросце ад пяці да чатырнаццаці гадоў, прывозілі з найбліжэйшых раёнаў Гомельшчыны, мясцовых прымушалі прыходзіць самім на «здачу аналізаў крыві». Такое вось было «донарства» для нямецкіх салдат.

Дзяцей купалі ў рацэ. Некаторыя з іх кідаліся ў ваду, спрабавалі перапліць на іншы бераг, каб схавацца ў кустах. Іх даганялі аўтаматныя чэргі.

Дзеці спалі на саломе, і марна спадзяваліся, што пасля забору крыві ім дадуць паесці. Як успамінаў Рыгор Галубіцкі, салодкая вада ды ў супе 10 крупінак проса, і гэта ўсё.

«Чым далей ад нас жахі вайны, тым цяжэй паверыць у тое, што падобнае сапраўды было».

...Звестак пра такія лагеры амаль не засталося. Сіламі спецыяльнай зондаркаманды целы забітых спальваліся, дакументы знішчаліся, а значыць, знішчаліся доказы.

Калі Чырвоная Армія была блізка, фашысты пагрузілі дзяцей у вагоны, але на перагоне Асіповічы — Пухавічы эшалон быў перахоплены савецкімі войскамі, і вязняў вызвалілі. З Чырвонага Берага вызвалялася адна дзяўчынка — дачка Ніказдіма Раманенкі, але і яна праз тры дні памерла.

...Чым далей ад нас жахі вайны, — падсумоўвае **спадар Анатоль Хлапкоў,** *— тым цяжэй паверыць у тое, што падобнае сапраўды было».*

І насамрэч: цяжка паверыць, забыць немагчыма.

Гэтая ж думка — чырвонаю ніткай — у іншых лістах.

«Для маіх дзяцей (а тым больш для ўнукаў) вайна — тэма, як той казаў, не асабістая. Нават дзень Перамогі для іх не такі ўрачысты, як для мяне. І гэта пры тым, што людзі яны адукаваныя, пра вайну і чыталі, і чулі, і ведаюць шмат. Не абмінула яна, відаць, ніводную сям'ю, — «прайшлася» і па нашай, — піша **спадар Аляксандр Матошка з Расоншчыны.** *— Загінуў на фронце, не дажыў да Перамогі мой дзед, бабуля Антаніна свой доўгі век звекавала ў адзіноце. Вайна забрала ў яе і траіх дзяцей, якія памерлі ад голаду і хвароб... Гэта і мая страта, бо мог мець дзядзьку Уладзіміра, якому на той час было 12 гадоў, цёцак Любу (4 гадкі) і Ніну. Ёй, двухгадовай, дамавінай была звычайная даматканая хустка.*

Бабуля помніла гэта да скону. Помню і я. А вось ці будзе гэта памяць святой для ўнукаў ды праўнукаў...

У іх сёння новыя, электронныя забавы, якія часцяком да таго ж — крыніцы хлусні: паспрабуй яшчэ разбярыся, з якіх трэба «піць»...

Людзі старэйшых пакаленняў скажуць адназначна: з чыстых — з расказаў родных бабуль і дзядоў, з твораў сумленных гісторыкаў і пісьменнікаў», — лічыць **спадар Аляксандр Матошка.** І згадвае, што некалі ім, вучням малодшых класаў, настаўніца ўголас чытала расказы беларускіх дзяцей аб тым, што яны перажылі ў гады вайны. Кніга называлася «Ніколі не забудзем». Слухаючы яе, асобныя з вучняў плакалі і, напэўна ж, верылі, што сапраўды не забудзем, але...

«Неяк мы, самадзейныя паэты, выступалі ў адной з нашых школ: чыталі свае вершы пра вайну, расказвалі пра герояў-землякоў і раптам пачулі: «Ой, гэта ж было так даўно...»

«Думаеце, фраза зляцела з вуснаў нейкага неразумнага дзіцяці? Не, — канстатуе **спадар Аляксандр,** *— так сказала... настаўніца. Чаго тады чакаць ад вучняў?»*

Згадзіцеся: ёсць пытанне. Як і спроба адказу ў лісце **спадара Яўгена Долава з Мінска.** *«Пачуў пра намер Міністэрства адукацыі ўвесці ўступны экзамен па гісторыі Беларусі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і падумаў, ці не будзе ён трохі запозненым і недастатковым, бо мала пасеяць у галовах нашых недарослых разумнае, добрае, вечнае. Трэба яшчэ і бараніць яго ад засмечвання лухтой, хлуснёй, а то і адкрыта варожай дэзынфармацыяй, скіраванай на тое, каб ператварыць нашу моладзь у манкуртаў...»*

Яшчэ ў канцы пазамінулага стагоддзя выгнаны з Англіі англійскі пісьменнік Оскар Уайльд заявіў: *«Адзіны наш доўг перад гісторыяй — гэта пастаянна яе перапісваць». Падобна на тое, што на Захадзе свята выконваюць гэты цынічны запавет. І такой бяды, калі б, хочучы займець сваіх герояў і ўзвысіць свае заслугі, яны не прыніжалі подзвігі нашых бацькоў, дзядоў і прашчураў. Забыліся, відаць, пра таго ж Цыцэрона, які лічыў, што першы закон гісторыі — баяцца любой хлусні, а потым не баяцца любой праўды. Ці камусьці хочацца паказаць нас untermensch-амі, недачалавекамі, як гэта было ў мінулую вайну?*

«Больш за 30 гадоў я не трымаў у руках падручнікаў па гісторыі, але гэта не перашкаджае мне прызнаваць значны ўклад у агульную перамогу генерала Эйзенхаўэра і бэсціць прэзідэнта Эйзенхаўэра за эскалацыю халоднай вайны і паляванне на ведзьмаў. Я помню пра Дэ Голя і Чэрчыля, пра Людвіка Свабоду, Войцэха Ярузельскага, нават Героя Савецкага Саюза немца Фрыца Шменкеля. Упэўнены, што легіён нашых прафесійных гісторыкаў можа стварыць (калі ўжо не стварылі) нашу праўдзівую гісторыю і здольны данесці яе да розумаў нашай моладзі. Больш складанай мне падаецца праблема абароны тых самых розумаў ад заразы, якую імгненна разносіць інтэрнэт...»

Напрыканцы аўтар ліста заўважае: *«Не магу не выказаць свайго абурэння некаторымі журналістамі, асабліва тэлевізійнымі. Дзень пры дні чую ад іх: «батл», «лакацыя», «калабарацыя»... Чым гэтым «грамацеям» не дагадзілі словы «спаборніцтва», «месца», «супрацоўніцтва»? Хто патлумачыць гледачам, якія не вучылі англійскай мовы, што такое лайфхак, хайп і (даруйце) фэйк?»*

І яшчэ адзін ліст, амаль даслоўна: *«21 чэрвеня 1941 года дзве сяброўкі Клава і Фрося паспяхова здалі апошні экзамен за першы курс Крычаўскага педвучылішча. Напярэдадні ў іх былі канікулы з хатняй ежай, з вячоркамі... Дзяўчаты ехалі дамоў, —* піша **спадарыня Наталля Сівак з вёскі Заполле Чэрвеньскага раёна.** *— Аднак найперш яны спяшаліся ў вёску Каранец да знакамітай краўчыхі цёткі Варкі, якая шыла ім новыя штапельныя сукенкі.*

Абновы атрымаліся што трэба! Фросі з Клавай заставалася прабегчы апошнія 8 кіламетраў. У лесе вадзіліся ваўкі, таму дзядзька Макар даў дзяўчатам па снапку абмалочанага жыта. Напагатове былі і запалкі. Ваўкі, як вядома, баяцца агню, але ж, дзякаваць богу, абышлося: дзяўчаты амаль дабеглі да месца, кінулі на дарогу непатрэбныя снапы і на нешта падпалілі... Салома тут жа ўспыхнула і амаль у тую ж хвіліну пачуўся незвычайны гул: ад лесу на дзяўчат насоўвалася цёмная сцяна вышынёю да самага неба.

«У маладых сёння новыя, электронныя забавы, якія часцяком да таго ж — крыніцы хлусні, і паспрабуй яшчэ разбярыся, з якіх трэба «піць»...

Не помнячы сябе ад страху, час ад часу падаючы, да крыві разбіваючы локці і калені, сяброўкі дабеглі да патрэбнай хаты і там праз колькі гадзін пачулі страшную навіну: пачалася вайна...

Клавай, — піша **спадарыня Наталля,** *— была мая мама, Фросяй — яе сяброўка. Ні давучыцца, ні сустрэцца адразу пасля вайны ім не давялося. Ды і не шукалі яны сустрэчы — іншых хапала клопатаў, аднак...*

Летам 1977-га ў нас ганаваў татаў калега. Звалі яго Іван Паўлавіч Стагначоў. Досыць рэдкае прозвішча. «У Фросі было такое ж», — сказала мама, успомніўшы сваю найстрашнейшую ноч. І аказалася, што мужчына ўжо чуў гэту гісторыю: Фрося была яго сястрой.

Праз два тыдні сем'і сяброўак сустрэліся. Мяне, шкада, дома не было. І потым я не распытала маму пра гэту сустрэчу...

Але 22 чэрвеня мы, яе дзеці і ўнукі, запалім свечкі, памянём загінулых, усіх, хто спазнаў тую бяду, хто выжыў і перамог. Успомнім гэты самы страшны, самы жалобны дзень і накажам нашчадкам, каб і яны таксама памяталі і бераглі, шанавалі мір».

Дадаць да гэтых слоў як быццам няма чаго. Ці не так?

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

З рэдакцыйнай пошты

З ЛЮБОЎЮ ДА СПРАВЫ І ЖЫЦЦЯ

Галоўнае багацце чалавека, відаць, складаецца з дзвюх рэчаў, з двух складальнікаў жыцця: сям'я і праца. Заўсёды, каб жыць светла, у дабрыні ды лагодзе, хочацца прыходзіць дахаты як на свята. Каб у клопатах, якія яны б складаныя ні былі, каб за мітуснёй, без якой, відаць, і дня не бывае, радавацца, што ў цябе, у тваіх самых блізкіх людзей усё добра, што мы любім і паважаем адзін аднаго, што гатовыя заўсёды спрыяць, дапамагаць адзін аднаму. І другая частка шчаслівага жыцця — ісці з радасцю на работу, рабіць нешта вартае, быць запатрабаванымі людзьмі, калектывам... Мне здаецца, што якраз у такім святле, у такім добрым атачэнні жыла і жыве Алена Васілеўна ЛІПІНСКАЯ, якая многія гады адпрацавала галоўным заатэхнікам ААТ «Шчомысліца» ў Мінскім раёне.

Спярша, у 1977-м, закончыла Болагаўскі саўгас-тэхнікум па спецыяльнасці «заатэхнія». Закончыла з адзнакай ці, як яшчэ кажуць, з чырвоным дыпломам. Разумела, што прафесія патрабуе ведаў, што заўтра ў рабоце спатрэбіцца многае адкрываць нанава, таму максімальны багаж трэба было займець у час вучобы. Праз год адважылася і паступіла ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, якую закончыла ў 1983 годзе і па сваёй роднай спецыяльнасці атрымала кваліфікацыю «зоаінжынер».

Разам з Аленай Васілеўнай перабіраем стос грамат, падзяк, пад якімі стаяць подпісы аўтарытэтных, вядомых і сёння кіраўнікоў АПК, Мінскай вобласці і Мінскага раёна. Ганаровая грамата камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама, падзяка Мінскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў АПК, падзяка Мінскага аблвыканкама, Ганаровая грамата Мінскага райвыканкама... А вось — дыпломы аб занясенні галоўнага заатэхніка Алены Ліпінскай на раённую Дошку гонару. І ў 2005 годзе такая падзея адбылася, і ў 2016-м... На адной з грамат такі надпіс: «... за добрасумленную плённую працу і значны асабісты ўклад у развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці Мінскай вобласці». Можна толькі здагадвацца, колькі выпрабаванняў, дасягненняў за такімі адзнакамі!.. Колькі бяссонных начэй, колькі трывог за жывёлу, за гаспадарку!.. Няма ніякіх сумненняў, што Алена Васілеўна — чалавек моцнай загартоўкі, моцнай волі, моцнага характару. У гэтай жанчыны зараз юбілей, з якім і хацелася б павіншаваць... Упэўнены, што да мяне можа шмат хто далучыцца з ААТ «Шчомысліца», дзе яна 41 год (з 1977-га да 2018 года!) адпрацавала галоўным заатэхнікам. Уражальны працоўны стаж шчыравання на адзіным месцы, на адной пасадзе, такой нялёгкай, няпростай... Павіншуюць маці і цешчу муж Аляксандр Аляксандравіч, дзве дачушкі, два зяці, двое ўнукаў. І ў сямейным атачэнні, у сямейнай цеплыні працягваецца новае працоўнае, зусім не пенсійнае жыццё Алены Васілеўны Ліпінскай. Дабрыні і святла вам, шчырай любові родных і блізкіх, дарагая Алена Васілеўна!..

Сяргей ШЫЧКО,
Мінскі раён.

Ликвидатор Частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ» (УНП 192840238, г. Минск) в связи с ликвидацией объявляет о проведении 19.07.21 в 12.00 торгов в форме аукциона по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н по продаже имущества частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ»:

ЛОТ № 1. Печатная машина MAXIFLEX 820-B COLORI. Начальная стоимость: 522 000 руб., в том числе НДС 87 000 руб.

ЛОТ № 2. Машина высокой печати Taiyo Label Printing Press TLS-250-8C+1F. Начальная стоимость: 236 400 руб., в том числе НДС 39 400 руб.

Шаг торгов – 5 %. Задаток в размере 5 % от начальной цены лота перечисляется по следующим реквизитам: УНП 192840238, р/с BY86OLMO30120000632700000933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60, корп. 2, БИК OLMPBY2X.

Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости соответствующего лота на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 3 дней со дня проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи предмета торгов осуществляется в течение 5 дней с момента подписания договора. Предмет торгов по договору купли-продажи предмета торгов передается покупателю в течение 1 дня с момента полной оплаты.

Имущество находится в г. Минске. Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by **в срок до 17.00 16.07.21 г.** Справки по тел.: +375 29 148-01-01 («Вайбер», «Телеграм»); +375 29 763-97-34 («Вайбер», «Телеграм»).

ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ от 04.12.2020 № 140 (3502), опубликованную в газете «Минский курьер», по жилому дому «Парус» по г. п. 2.1 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 1-я очередь строительства. Жилой дом «Маяк» по г. п. № 1, жилой дом «Парус» по г. п. № 2.1, многоуровневая гараж-стоянка по г. п. № 4.1»

Условия оплаты для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – первоначальный взнос в размере **30 % стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

УНП 192400611

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Продавец	**ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61**
Предмет аукциона – оборудование (бывшее в употреблении), реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Наконечникова, 50:	
1. Машина формовочная DISAMATIC 2110 MK3 (ID № 97.2704) в составе: формовочная машина; стержнеукладчик; электронная панель оператора PLC; два конвейера; лестницы и площадка обслуживания. 2. Бункер (формовочной смеси) с отводным конвейером и воронкой	
Начальная цена	**240 000 евро с учетом НДС 20 %**
Сумма задатка	**10 000 евро. Сумма задатка перечисляется в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату проведения платежа**
Задаток перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638. Нерезидентами РБ задаток может перечисляться на в/с (евро): BY70BELB30120048350030226000	
Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Если победителем признается участник – резидент РБ, то оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях по официальному курсу НБРБ на дату проведения платежа. Если победителем признается участник – нерезидент РБ, то оплата предмета аукциона осуществляется в евро	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона	**19.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**15.07.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**
Предмет электронных торгов: транспортное средство, бывшее в употреблении	
Седельный тягач МАЗ 642208 АВ 7221-5, 2004 г. в., инв. № 100000042879.	
Местонахождение: Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 165, филиал «Молодечненское УБР ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 10 080,00 бел. руб.	
Контактные лица по осмотру: Танюкевич Сергей Эдвардович – начальник цеха +375 29 175 27 02; Мейсак Александр Викторович – зам. начальника цеха 80176 77 11 35	
С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 (три)процента** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов	
Предыдущее извещение о проведении электронных торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 09.09.2020, 15.09.2020, 27.10.2020	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Дата, место и время проведения электронных торгов: Начало торгов в **11.00 29.06.2021.** Окончание торгов в **12.00 29.06.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата, место и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **28.06.2021** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by	

Контактные телефоны:
+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С.В. извещает о проведении 30 июня 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условия продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером **340100000002000638** площадью **2,0237 га,** предоставлены ОАО «Гомельский рыбокомплекс» на праве постоянного пользования. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов), для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст. ст. 19, 45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **4.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %				
Местонахождение лотов: Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16				
2	ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). Ворота металлические с ограждением (инв. № 1000). Ограждение (забор кирпичный, инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008)	**381 520,00**	19 076,00	38 152,00
3	Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0024). Трансформаторная подстанция (ТТП) (инв. № 0026). Склад (инв. № 0027). Склад (инв. № 0035). Эстакада (инв. № 0037)	**27 960,00**	1 398,00	2 796,00
4	Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029)	**100 560,00**	5 028,00	10 056,00
9	Теплосети (инв. № 2002)	**1 880,00**	94,00	188,00
10	**Автомобиль ГАЗ 3307 «КУПАВА»** 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341)	**2 672,00**	133,60	267,20

Продавец: ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 733-03-49, управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 июня 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 28 июня 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.02.2021 г. № 34 (29403). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 20.07.2021 открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белэлектромонтаж»

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 710/С-52306 – административное здание, общ. пл. (кв. м): 370,9. Составные части и принадлежности: асфальтовое покрытие, забор кирпичный, забор проф. ПСА 20/05, ограждение площадки ТБО из кирпича, ограждение площадки ТБО из металлического профиля, шлагбаум ASB. Обременение: ипотека. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52309 – здание мастерской,** общая пл. (кв. м): 1746. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52307 – здание склада,** общ. пл. (кв. м): 265, обременение: ипотека. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52310 – здание склада,** общ. пл. (кв. м): 226. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52312 – здание гаража,** общ. пл. (кв. м): 447. Обременение: ипотека. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52316 – здание теплопункта,** общ. пл. (кв. м): 22. **Капитальное строение с инв. № 710/С-52314 – здание проходной,** общ. пл. (кв. м): 20. **Котел газогенераторный КВГТ-63**, г. в. – 2010, инв. № 312, з/н 193. **Кран-штабелер** с подкрановыми путями, инв. № 105, г. в. – 1977. **Кран-балка** с подкрановыми путями, инв. № 126, г. в. – 1976. **Кран-балка** с подкрановыми путями, инв. № 127, г. в. – 1978. **Насос Grundfos UPS 32-80 F,** инв. № 585, з/н 95906458, г. в. – 2012. **Насос Grundfos UPS 40-180 F,** инв. № 587, з/н 96401977, г. в. – 2012. **Оборудование тревожной сигнализации**, инв. № 578, в составе: прибор приемно-контрольный охранный ППКО 063–2-3 «Аларм-3», модуль сопряжения «Аларм – GSM3», блок подключения БП «АЛАРМ», БВИ, автоматический выключатель, устройство контроля персонала поста охраны УКП «Аларм». **Электротельфер с пролетными балками**, инв. № 125, г. в. – 1972, 1976, з/н 163478. **Кондиционер** (сплит-система Neoclima NS 12AHC/HU12), г. в. – 2012, з/н J22302921200027, инв. № 000009300. **Кондиционер** (сплит-система Neoclima NS 12AHC/HU12), г. в. – 2012, з/н J22302921200145, инв. № 000009300. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, 11, 11/4, 11/2, 11/3,11/5, 11/1 на земельном участке с кадастровым номером 741000000002000003 (право постоянного пользования), площадь – 1,0652 га. **Начальная цена продажи: 855 856,90 бел. рубля с учетом НДС (20 %).**

Аукцион состоится 20 июля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

Свидетельство о государственной регистрации ИП Ясюкевич Дмитрий Викторович **считать недействительным в связи с утерей** (УНП 192034294).

Падзея

ЭКАЛОГІЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ

Удзел грамадскасці ў вырашэнні экалагічных праблем і абмен вопытам у прымяненні «зялёных» тэхналогій сталі галоўнымі тэмамі І Міжнароднай спецыялізаванай экалагічнай выстаўкі «ECOLOGY EXPO — 2021» і XVI Рэспубліканскага экалагічнага форуму.

Мерапрыемствы, якія праходзілі з 3 да 5 чэрвеня ў Мінску, сабралі ў нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» прадстаўнікоў прыродаахоўнай службы краіны, дзяржорганаў, бізнесу, прамысловых прадпрыемстваў, навуковых установ і грамадскіх арганізацый, міжнародных партнёраў і экспертаў, якія працуюць на «зялёнае» развіццё нашай краіны, папулярызацыю экалагічнага ладу жыцця, удасканаленне тэхналогій для менш шкоднага ўплыву на навакольнае асяроддзе.

Арганізатарамі выстаўкі і форуму выступілі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа», Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Удзельнікі форуму разгледзелі пытанні ўдасканалення экалагічнай палітыкі, развіцця эканомікі замкнутага цыкла і нізкавугляроднага развіцця, адаптацыі розных галін да змены клімату, павышэння ўстойлівасці экасістэм, механізмаў рэгіянальнага супрацоўніцтва, а таксама павышэння ролі грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў.

Падчас цырымоніі адкрыцця выстаўкі і форуму **намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр СУБОЦІН** адзначыў, што «зялёны» парадак дня становіцца модным, важным трэндам ва ўсіх галінах беларускай эканомікі. У краіне ўдзяляецца ўвага перапрацоўцы адходаў і ўдасканаленню работы палігонаў ЦКА, ліквідуюцца несанкцыянаваныя звалкі, будуюцца станцыі абезжалезвання ў рамках праграмы «Чыстая вада», працуюць над мінімізацыяй вугляродных выкідаў у атмасферу. Вялікім попытам пачынаюць карыстацца экалагічныя прадукты, развіваецца экалагічнае земляробства.

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК адзначыў, што экалагічная тэматыка займае высокія пазіцыі ў глабальным парадку дня.

— Я ўпэўнены, што пляцоўкі гэтай выстаўкі і экалагічнага форуму паслужаць далучэнню да гэтай тэматыкі ўсё большай колькасці людзей, і эканоміка будзе станавіцца ўсё больш экалагічнай, цыркулярнай, «зялёнай», — падкрэсліў міністр.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Генеральны партнёр выстаўкі — брэнд электразарадак «Malanka». Мерапрыемствы праводзіліся пры падтрымцы кампаній «ТКО-Інфарм», сістэмы Coca Cola ў Беларусі, УП «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь», філіяла «Вытворчы камбінат» ААТ «Гомельтранснафта Дружба», ААТ «БелАЗ», ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат», групы кампаній 1АК-Group, базы адпачынку «Мілаград».

Паводле яго слоў, кожны форум ніколі не праходзіць бясследна — абавязкова рэалізоўваюцца розныя праекты, малыя ці вялікія, але значныя для экалогіі. Так, сёлета ў краіне на базе ўжо існуючага прадпрыемства пачне працаваць завод па ўтылізацыі небяспечных адходаў у Чачэрску.

Смеццевая праблема стала адной з цэнтральных тэм як на выстаўцы, так і на форуме. Андрэй Худык адзначыў, што Беларусь значна прасунулася ў яе вырашэнні і знаходзіцца ў лідарах на постсавецкай прасторы па ўцягванні ў гаспадарчы абарот камунальных адходаў. Сёння 27 % ЦКА з агульнай колькасці вымаецца і выкарыстоўваецца ў эканоміцы краіны.

— За пяцігодку мы павінны дайсці да 35 %, а да 2035 года — да 65 %, — сказаў міністр. — Гэта даволі амбіцыйныя планы. І толькі разам мы зможам вырашыць гэту задачу. Гэта паасобны збор і максімальнае выманне другасных матэрыяльных рэсурсаў, стварэнне аб'ектаў па выкарыстоўванні адходаў — усё тое, што сёння ўрадам і робіцца.

Акрамя рэалізацыі канкрэтных праектаў, вельмі важна далучаць грамадскасць да экалагізацыі жыцця ў цэлым і эканомікі ў прыватнасці, упэўнены Андрэй Худык. Ён падзякаваў грамадскасці і асабліва грамадскім эколагам, якія падтрымалі мерапрыемства, а таксама прыехалі на форум з канкрэтнымі прапановамі і рашэннямі экалагічных праблем.

Павіншавала ўдзельнікаў выстаўкі і форуму **пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаанна КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ.** Яна адзначыла рух нашай краіны па шляху да вугляроднай нейтральнасці.

— Спадзяёмся, што Рэспубліка Беларусь працягне павышаць узровень свайго нацыянальнага ўкладу ў глабальнае зніжэнне шкодных выкідаў, — сказала Іаанна Казана-Вішнявецкі. — Надзвычайна важна, што ў краіне ідзе работа над цэлым шэрагам экалагічных законаў, якія датычацца «зялёнай» эканомікі, кіравання адходамі і воднымі рэсурсамі, нізкавугляроднага развіцця, а таксама захавання біяразнастайнасці.

Пастаянны каардынатар ААН таксама адзначыла, што пераход да «зялёнай» эканомікі з'яўляецца адным з чатырох стратэгічных прыярытэтаў дзейнасці арганізацыі ў межах рамачнай праграмы супрацоўніцтва ААН і Беларусі на 2021—2025 гады:

— Мы гатовы працаваць з усімі партнёрамі, паказваць найлепшы замежны вопыт і расказваць свету пра тое, што ў Беларусі атрымалася, як добра краіна развівае гэты кірунак, і прасоўваць партнёрства з дзяржаўнага боку, недзяржаўных арганізацый і прыватнага сектара.

Вераніка КОЛАСАВА.

«Зялёныя» тэхналогіі

ECOLOGY EXPO: сябе паказаць і абмяняцца вопытам

Адначасова з XVI Рэспубліканскім экалагічным форумам праходзіла і Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-форум «ECOLOGY EXPO-2021». У складзе экспазіцыі было 109 удзельнікаў.
Выстаўка выклікала цікавасць не толькі ў дэлегатаў форуму, але і ў кіраўнікоў розных прадпрыемстваў, гараджан. Як паведаміла Алена МЕЛЯШКОВА, намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды, электронную рэгістрацыю на выстаўку прайшлі 1620 чалавек, а наведалі больш за тры тысячы гасцей.

У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — АБЫХОДЖАННЕ З АДХОДАМІ

Было прадстаўлена шмат прадпрыемстваў, якія займаюцца зборам і ўтылізацыяй адходаў. Сярод іх — КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці».

Польская кансалтынгавая і інжынірынгавая кампанія Geocoma спецыялізуецца на паслугах, накіраваных на ахову навакольнага асяроддзя ад небяспечных адходаў. У яе арсенале — ачыстка зямлі і грунтавых вод ад небяспечных рэчываў, якія могуць пагражаць здароўю чалавека і наваколлю. Прычым спецыялісты могуць выконваць работы як на месцы забруджвання, так і арганізаваць транспарціроўку шкодных рэчываў для далейшай утылізацыі за межамі нашай краіны.

Брэсцкі смеццеперапрацоўчы завод вядомы не толькі профільнай работай, але і тым, што тут дзейнічае ўчастак па ўтрыманні бяздомных кошак ды сабак, аказваюцца ветэрынарныя паслугі.

Стэнд сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства па абыходжанні з адходамі REMONDIS карыстаўся папулярнасцю, бо тут дэманстравалі кантэйнер для збору пратэрмінаваных лекаў. Мінчане актыўна цікавіліся, дзе такія ўстаноўлены. Цяпер ужо ў многіх сталічных паліклініках.

У нас нямала прадпрыемстваў, тэхналогіі і прадукцыя якіх служаць ахове навакольнага асяроддзя. Толькі з Віцебска прыехалі два прадпрыемствы, якія выпускаюць

розныя абсталяванне для ачысткі вады: УП «Палімеркансрукцыя» — завод водаачышчальнага абсталявання і СТАА «Фортэкс — водныя тэхналогіі».

Кіраўнікі прадпрыемстваў не абыходзілі ўвагай стэнд цэнтра міжнародных эканамічных праектаў, сертыфікацыі і аўдыту «Экалогіяінвест», які мае вялікі досвед па ўкараненні і сертыфікацыі сістэм менеджменту навакольнага асяроддзя.

НАЙЛЕПШЫ ВОПЫТ

Некаторыя прадпрыемствы дзяліліся сваімі напрацоўкамі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, сярод іх — ААТ «Мазырскі НПЗ». Тут кантроль за экалагічным станам — адзін з прыярытэтных напрамкаў вытворчай дзейнасці. На заводзе больш за 15 гадоў паспяхова функцыянуе сістэма кіравання навакольным асяроддзем. Яна адпавядае патрабаванням стандарту ISO 14001-2015. Сярод прыродаахоўных мерапрыемстваў на Мазырскім НПЗ заслугоўвае ўвагі будаўніцтва ўстаноўкі вытворчасці серы «Сера-1». Гэтае абсталяванне вырашае задачу ўтылізацыі серавадароду пры адначасовым зніжэнні выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу. Увесь утылізаваны серавадарод пераўтвараецца ў сыравіну, якая паступае на Гомельскі хімічны завод і выкарыстоўваецца там для вытворчасці таварнай прадукцыі. І гэта не адзіны прыклад уключэння адходаў вытворчасці ў другаснае выкарыстанне. Адходы, якія ўтрымліваюць нафту, і будаўнічыя адходы перапрацоўваюцца на ўласных аб'ектах, астатнія другасныя матэрыяльныя рэсурсы перадаюцца ў спецыялізаваныя арганізацыі для далейшага выкарыстання. З 2015 да 2020 года на Мазырскім НПЗ уведзены ў эксплуатацыю аўтаматызаваныя сістэмы кантролю на 10 крыніцах выкідаў. У найбліжэйшых планах прадпрыемства — установўка яшчэ 14 АСК. Такім чынам, каля 70 % ад агульнай колькасці выкідаў забруджвальных рэчываў будуць кантралявацца аўтаматычна.

Для зніжэння нагрузкі на раку Прыпяць на заводзе ўжываецца абаротнае водазабеспячэнне. Яно дазваляе паменшыць выкарыстанне свежай вады, якая здабываецца на берагавой помпавай станцыі завода. Гэтая ж тэхналогія дазваляе скарачаць аб'ёмы сцёкавых вод, якія скідваюцца ў Прыпяць.

На заводзе пачата будаўніцтва ўстаноўкі ўтылізацыі сярніста-шчолачных сцёкаў для ачысткі хімічных забруджванняў сцёкавых вод перад паступленнем іх на ачышчальныя збудаванні завода. Прасцей кажучы, сярніста-шчолачныя сцёкавыя воды перад скідам іх на збудаванні механічнай і фізіка-хімічнай ачысткі будуць падвяргацца папярэдняй ачыстцы.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Устойлівае развіццё

«ЗЯЛЁНАЯ» ЭКАНОМІКА І ЭЛЕКТРАМАБІЛІ

Што робіцца ў свеце і ў нашай краіне для пераадолення кліматычнага крызісу

Устойлівае спажыванне, развіццё электратранспарту і гарадской мабільнасці, энергетыкі, «зялёныя» лічбавыя тэхналогіі, экалагічны турызм, развіццё эканомікі замкнутага цыкла, арганічнага земляробства, будаўніцтва «разумных» гарадоў, «зялёнае» фінансаванне... Такія прыярытэтныя напрамкі развіцця «зялёнай» эканомікі вызначаны ў краіне да 2025 года. Як фарміруецца экалагічная палітыка ў Беларусі і што робіцца для «зялёнага» развіцця за мяжой, расказалі эксперты.

АДНАЎЛЯЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ І ЭЛЕКТРАКАРЫ

Унёсак краіны ў сусветнае ўстойлівае развіццё забяспечаны глабальнай экасістэмай, роляй нашых лясоў, балот, іншых прыродных аб'ектаў, што дазваляе пазіцыянаваць краіну як экалагічнага донара, адзначыў **Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— У краіне распрацоўваецца Стратэгія доўгатэрміновага развіцця з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў і Нацыянальны план дзеянняў у галіне адаптацыі да змен клімату. Рэалізоўваюцца стратэгіі адаптацыі сельскай і лясной гаспадаркі да кліматычных змен да 2050 года.

Пры гэтым патрабуюць далейшай прапрацоўкі пытанні выкарыстання сістэмы дзяржаўных «зялёных» закупак, экалагічнай сертыфікацыі прадпрыемстваў, пашырэння навукова-даследчай дзейнасці. Вынікам укаранення канцэпцыі «зялёнага росту» павінен стаць пераход да нізкавугляроднай эканомікі. Неабходна ўмацаваць сістэму абыходжання з адходамі прамысловасці і спажывання, эканамічна стымуляваць рэсурса- і энергазберажэнне, укараняць інавацыі ў навуку, адукацыю і інфармацыйныя тэхналогіі.

— Плануецца, што энергаёмістасць ВУП зменшыцца да ўзроўню 2020 года на 7 %, а доля МВП застанецца на існуючым узроўні. Сёлета плануецца скарачаць выкіды CO_2 на 760–770 тысяч тон. За пяцігоддзе, як мяркуецца, будзе ўведзена 89 энергакрыніц на біяпаліве і торфе агульнай цеплавой магутнасцю 491 МВт, — абазначыў прыярытэты ў галіне энергазберажэння **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці.** — З дапамогай абсарбцыйных цеплапомпаў плануецца выкарыстоўваць і ўтылізаваць энергію другасных нізкапатэнцыяльных энергарэсурсаў у выглядзе вады тэмпературай 20–30 градусаў, якая цяпер скідваецца ў градзірні. Гэта дазволіць замясціць у краіне да 1 млрд м³ газу.

Паспрыяць памяншэнню выкідаў парніковых газаў можа і электратранспарт. Па прагнозах, да 2030 года на дарогах краіны каля 20 % аўто будуць з электрарухавіком, лічыць **Андрэй КОЦІК, намеснік гендырэктара па будаўніцтве, агульных пытаннях і ідэалагічнай рабоце канцэрна «Белнафтахім»:**

— Летась быў падпісаны ўказ, які стымулюе набыццё электрааўтамабіляў. Да канца 2021-га ў Беларусі будзе ўжо 600 зарадных станцый для электракараў. Прапрацоўваецца будаўніцтва суперхуткасных комплексаў магутнасцю 7-8 МВт. Паступова будзе пашырацца мадэльны рад электракараў, а іх кошт да 2027-га зменшыцца да 19 тысяч еўра.

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў НАВАКОЛЛЕ І КЛІМАТЫЧНАЯ АДАПТАЦЫЯ

Разам з тым дзейнасць чалавека спрыяе экалагічнай дэградацыі і глабальнаму пацяпленню. Дынаміка змены клімату і скарачэння біяразнастайнасці апярэджвае самыя песімістычныя прагнозы, заўважыла **Аляксандра САЛАЎЁВА, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі.**

— Пандэмія, нягледзячы на цяжкія наступствы для здароўя і эканомікі, часова зрабіла станоўчы ўнёсак у захаванне навакольля. Важна, каб COVID-19 стаў для нас абуджальным сігналам, гэта ўнікальная магчымасць выйсці з пандэміі ў больш «зялёную» будучыню. Сёння свет мае два магчымыя сцэнарыі для аднаўлення. Так званае «вяртанне да нармальнасці» за кошт рэсурсаў традыцыйнай эканомікі, пры якім глабальны рост тэмпературы павялічыцца больш як удвая да канца стагоддзя. Або рух наперад за кошт укаранення інавацыйных эканамічных мадэляў, у аснове якіх «зялёныя» рашэнні і тэхналогіі.

Ігнараванне кліматычных прыярытэтаў можа каштаваць сусветнай эканоміцы каля 14 трыльёнаў долараў да 2025 года. Па разліках ААН, для паспяховага вырашэння комплексных прычын кліматычнага крызісу неабходна інвеставаць у навакольнае асяроддзе каля 8 трыльёнаў долараў.

За апошнія 30 гадоў у краінах ЕС страты, звязаныя з кліматычнымі ўмовамі, склалі каля 11 млрд еўра ў год. Да канца стагоддзя яны могуць узрасці да 240 млрд. Кліматычныя змены ўсё роўна будуць працягвацца, і свету трэба адаптавацца да іх, лічыць **Марыя ФАЛАЛЕЕВА, кансультант у галіне кліматычнай палітыкі EVRESCO (Ірландыя):**

— Трэба скарачаць рызыкі вытворчасці ва ўсіх галінах дзейнасці, нават пры планаванні канструкцый і ўзвядзенні будынкаў. Прынамсі, мяркуецца ўкараненне ўстойлівых дрэнажных сістэм, калі ваду не будуць адводзіць праз ліўневую сістэму з тэрыторыі гарадоў, а стануць утрымліваць яе ў межах гарадоў і максімальна выкарыстоўваць. Такім чынам будуць стварацца «зялёныя» прасторы для арганізацыі камфортнага мікраклімату і адаптацыі да кліматычных змен. Аднак для гэтага патрэбна супрацоўніцтва жыхароў і самых розных структур.

Ірына СІДАРОК.

Грамадская ініцыятыва

Крок насустрач

Зрабіць свет чысцейшым можна толькі сумеснымі намаганнямі, упэўнены грамадскія эколагі і прадстаўнікі дзяржорганаў

Цэнтральнай тэмай XVI Рэспубліканскага экалагічнага форуму значылася «Далучэнне грамадскасці да прыняцця экалагічна значных рашэнняў». На секцыі, прымеркаванай да 20-годдзя грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета Мінпрыроды, прадстаўнікі дзяржорганаў і грамадскіх арганізацый падзяліліся сваім вопытам рашэння праблем у гэтай сферы.

Дзякуючы дзейнасці праекта «Прырода без фармацэўтычных адходаў» у краіне пашыраецца сетка збору пратэрмінаваных лекаў.

— Без грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян мы не змаглі б вырашыць ніводную экалагічную задачу, — адзначыў **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Баляслаў ПІРШТУК.** — Мінпрыроды заўсёды аддае ўвагу пазіцыі грамадскасці па ўсіх прыродаахоўных пытаннях, улічвае іх заўвагі па праектах нарматыўных прававых актаў, мерапрыемствах, кампаніях. Пры гэтым у нас ёсць рэзервы для яшчэ больш поўнага і адкрытага ўдзелу грамадскасці. З улікам гэтага рыхтуюцца і змяненні ў Закон «Аб ахове навакольнага асяроддзя».

Алена ПАЎЛАВА, начальнік аддзела аховы навакольнага асяроддзя ўнітарнага прадпрыемства «БелНДІ гарадабудаўніцтва» расказала пра спосабы саўдзельніцтва грамадскасці ў праектаванні гарадскога асяроддзя. Па яе словах, правядзенне розных апытанняў, інфармацыйных сустрэч дапамагае не толькі даведацца, чаго хочуць гараджане, але і дазваляе сфарміраваць іх горадабудаўнічую культуру.

Яна таксама дала рэкамендацыі жыхарам, якія хочуць актыўна ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў: сачыць за рэсурсамі, дзе з'яўляецца інфармацыя пра новыя праекты, не чакаць грамадскіх абмеркаванняў, а прапаноўваць свае ідэі па змене гарадской прасторы ўжо цяпер, звяртацца за дапамогай да мясцовых дэпутатаў, рабіць канструктыўныя заўвагі.

Дырэктар установы «Цэнтр экалагічнага і сацыяльнага развіцця» Вікторыя КАЛАЧ упэўненая — галоўнае, каб пры рэалізацыі праектаў насельніцтва і ўлада ішлі насустрач адзін аднаму. Так адбываецца ў краіне з вырашэннем праблемы збору пратэрмінаваных лекаў. Праект «Прырода без фармацэўтычных адходаў» дзейнічае з 2019 года. З яго дапамогай у 16 гарадах і гарадскіх пасёлках Беларусі з'явіліся 33 спецыяльныя кантэйнеры для пратэрмінаваных лекаў, і дадзеная сетка паступова пашыраецца. У 2020 годзе ў краіне быў прыняты ТКП, які прадугледжвае стварэнне сістэмы збору фармацэўтычных адходаў. А сёлета пачалася ўстаноўка адпаведных кантэйнераў у паліклініках Мінска.

Старшыня Краснапольскага раённага савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН падзялілася досведам узаемадзеяння ініцыятыўнай групы з органамі ўлады, мясцовым самакіраваннем, бізнесам. З 2014 года ў рэгіёне былі рэалізаваны шэсць экаініцыятыў на суму больш за 250 тысяч еўра, складзена пагадненне па клімаце і энергіі, распрацаваны пашпарт тэрытарыяльнаарыентаванага развіцця раёна, а цяпер распрацоўваецца стратэгія яго ўстойлівага развіцця да 2035 года. Тут ствараюцца гадавальнікі пладова-ягадных культур, дзе мясцовыя жыхары вучацца вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю; рэалізоўваюцца ініцыятывы па ўключэнні прыродных аб'ектаў у турыстычныя маршруты і многае іншае.

Грамадскія абмеркаванні — вельмі важная дыялогавая пляцоўка, упэўнены **старшыня ГА «Экаманіторынг» Яўген ФІЛІМОНАЎ.** Толькі мясцовыя жыхары ведаюць, дзе лепш пасадзіць дрэвы, па якіх сцежках ходзяць людзі, якая колькасць аўтамабіляў можа размясціцца ў дварах...

— Без уліку іх меркавання прымаць якія-небудзь рашэнні бывае вельмі дорага з-за сацыяльнай напружанасці, якая можа ўзнікнуць пасля. Таму лепш ствараць дыялогавую пляцоўку да моманту рэалізацыі праекта, каб былі прынятыя ўзаемавыгадныя і правільныя рашэнні, — падкрэсліў эколаг.

Ён таксама абазначыў вялікую ролю валанцёраў у вырашэнні экалагічных праблем, правядзенні розных акцый, рэалізацыі праектаў. З дапамогай неабыякавых людзей і арганізацый у Гродзенскай вобласці ахоўваюцца рэдкія віды рыб, ачышчаюцца ад смецця берагі Нёмана і праводзіцца азеляненне тэрыторый.

Уладзімір НІСЦЮК, выканаўчы дырэктар асацыяцыі «Аднаўляльная энергетыка», лічыць, што без усіх складнікаў — дзяржавы, бізнесу, навукі, адукацыі і грамадскасці — экалагічныя ініцыятывы не могуць рэалізавацца. Так, пры ўдзеле асацыяцыі, куды ўваходзяць розныя юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, у краіне рэалізаваны праекты па ўстаноўцы біягазавых установак, будаўніцтве гідра- і сонечных электрастанцый, энергаэфектыўных дамоў.

— У ГКЭС мы можам браць удзел у фарміраванні нарматыўна-прававой базы, экалагічнай палітыкі, выказваць свае прапановы і быць упэўненымі, што нас выслухаюць, — адзначыў Уладзімір Нісцюк. — Гэта размова дзвюх сіл, якія здольныя ўплываць на рашэнне задач.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.

Біяразнастайнасць

ЭКАСІСТЭМЫ: АДНАВІЦЬ, ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ

Тарпанападобныя коні ў заказніку «Налібоцкі».

Адна з самых цікавых секцый XVI Рэспубліканскага экалагічнага форуму — «Аб захаванні і аднаўленні прыродных экасістэм». Гэта — моцны састаў дакладчыкаў, замежныя госці, якія ўдзельнічалі ў пасяджэнні анлайн, зацікаўленыя ўдзельнікі, якія задавалі пытанні, дыскутавалі.

Адкрываючы работу секцыі, **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ** адзначыў, што ў краіне пастаянна нарошчваецца плошча асабліва ахаваных прыродных тэрыторый. У нас 26 водна-балотных угоддзяў міжнароднага значэння, фарміруецца нацыянальная экалагічная і ізумрудная сеткі.

ЗАКАЗНІК «СПОРАЎСКІ» — КУЗНЯ НОВЫХ МЕТОДЫК

Міхаіл МАКСІМЕНКАЎ, старшы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН па біярэсурсах расказаў аб праблеме зарастання лугавых і балотных экасістэм драўнінна-хмызняковай расліннасцю і трыснягом. За апошнія дзесяцігоддзі гэты працэс закрануў больш за 606 тысяч га натуральных водна-балотных угоддзяў. Як дадзеная праблема вырашаецца? Па-першае, трэба вярнуцца да традыцыйнага выкарыстання пойменных лугоў, тобок касіць на іх траву. Больш складаная работа — высечка драўнінна-хмызняковай расліннасці з наступнай перапрацоўкай у паліўныя шчэпкі. Скошаны трыснёг можна выкарыстоўваць у якасці матэрыялу для ўладкавання дахаў. Таксама на лугах праводзіцца кіруемае выпальванне расліннасці. І яшчэ адзін спосаб — гэта зноў-такі вяртанне да традыцыйнага выкарыстання лугоў — выпас жывёлы. Але толькі цяпер на змену хатнім рагулям прыходзяць завезеныя турападобныя быкі і тарпанападобныя коні. Апошнія былі завезены ў нашу краіну з Нідэрландаў, добра прыжыліся і ўжо далі патомства. Як растлумачыў Міхаіл Максіменкаў, коні асвоілі ўсе адкрытыя прасторы плошчай каля 350 га, выядаючы пажухлую траву, асаку і трыснёг, яны спрыяюць росту травяной расліннасці.

Таксама навуковец расказаў пра досвед заказніка «Спораўскі» па аднаўленні пойменных лугоў. Тут з дапамогай сучаснай тэхнікі выдалілі драўнінна-хмызняковую расліннасць. Затым яе здрабнілі, спрасавалі і ў выніку атрымалі паліўны матэрыял. Таксама ў заказніку на аснове ўстойлівага выкарыстання пойменных лугоў і нізінных балот нарыхтавалі сена і траву на падсцілку. Усё гэта было рэалізавана, і атрыманай выручкі хапае на наступны цыкл работ па кіраванні балотнымі і лугавымі сістэмамі. Заказнік «Спораўскі», па ацэнцы Міхаіла Максіменкава, з'яўляецца кузняй новых методык па аднаўленні экасістэм балот і пойменных лугоў.

Тэхніка для апрацоўкі пойменных лугоў.

Падыходы па аднаўленні прыродных экасістэм адкрытых пойменных лугоў і балот апрабаваны ў рамках чатырох праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Гэта праект ЕС-ПРААН «Кліма-Іст: захаванне і ўстойлівае кіраванне тарфянікамі ў Рэспубліцы Беларусь для скарачэння выкідаў вугляроду і адаптацыі балотных экасістэм да змены клімату», два праекты ПРААН-ГЭФ: «Устойлівае кіраванне лясны мі і водна-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг» і «Распрацоўка інтэграваных падыходаў да кіравання водна-балотнымі ўгоддзямі з улікам прынцыпу шматмэтавага ландшафтнага планавання з мэтай атрымання шматбаковых экалагічных выгод», а таксама праект ЕС LIFE15 NAT/LT/ 001024 «Стварэнне сеткі ключавых месцапражыванняў для забеспячэння доўгатэрміновага спрыяльнага ахоўнага статусу вяртлявай чаротаўкі ў Літве».

Міхаіл Максіменкаў асабліва адзначыў, што найважнейшай умовай з'яўляецца забеспячэнне ўстойлівасці. Прасцей кажучы, павінна весціся сістэмная работа: мала выдаліць расліннасць, трэба затым забяспечыць пастаяннае скошванне лугавых траў або іншае іх выкарыстанне.

ВІНАВАТЫ НЕ ТОЛЬКІ КАРАЕД

Сасна займае больш за палову плошчы нашых лясоў. Яна ж першая пакутуе ад усыхання. **Алег БАРАНАЎ, загадчык лабараторыі геномных даследаванняў і біяінфарматыкі Інстытута лесу НАН, доктар біялагічных навук,** расказаў аб асноўных прычынах усыхання хвойных дрэў. Сярод іх: павышэнне сяреднясутачнай тэмпературы паветра, зніжэнне колькасці атмасферных ападкаў і ўзроўню грунтовых вод у вегетацыйны перыяд, цыклічныя ўспышкі колькасці насякомых-шкоднікаў, несвоечасовае правядзенне санітарна-аздараўленчых і лесаахоўных мерапрыемстваў, парушэнне функцыянавання гідралесамеліярацыйнай сеткі.

Вялікую небяспеку для сасны ўяўляе кораед — вельмі агрэсіўны і хуткі жук. Дастаткова сказаць, што ад першых сімптомаў паражэння да поўнага ўсыхання кроны праходзіць тры тыдні. Дрэва дыяметрам 19 сантыметраў знішчаюць пяць жукоў. У той жа час правесці раннюю дыягностыку практычна немагчыма. Пры гэтым жывучасць кораеда досыць высокая.

Што прапануюць беларускія навукоўцы ў барацьбе з гэтым агрэсарам? Па словах Алега Баранава, распрацаваны і ўкаранёны ў практыку фарамонныя прэпараты для маніторынгу і барацьбы са ствалавымі шкоднікамі, сярод якіх і кораед. Інстытутам лесу НАН сумесна з Белдзяржуніверсітэтам распрацаваны фарамоны для вяршыннага кораеда, вялікага і малога сасновага лубаеда, шасцізубчатага кораеда, паласатага кораеда. Таксама распрацавана тэхналогія ДНК-дыягностыкі патагенных грыбоў.

У сваім выступленні Алег Баранаў назваў наступныя практычныя крокі па барацьбе з кораедам, якія рэалізоўваюцца ў краіне: фарамонны нагляд, рэгуляцыя колькасці кораедаў шляхам выдалення заселеных шкоднікамі дрэў. Не лішняй з'яўляецца і апрацоўка пасечаных рэштак інсектыцыдамі. Вельмі важна правільна правесці ўтылізацыю пасечаных адходаў — спальваць іх або мульчыраваць.

«Смала — асноўная зброя супраць усялякіх кораедаў», — падкрэсліў вучоны. Таму ў Інстытуце лесу распрацавана тэст-сістэма для ранняй дыягностыкі высокасмолапрадукцыйных дрэў сасны звычайнай. Таксама навукоўцы праводзяць селекцыйна-генетычны адбор устойлівых да змены клімату дрэў сасны. Для захавання генафонду створаны генетычны банк Інстытута лесу, які дазволіць збераг чы ўсе віды пры лесааднаўленні на высечках у ачагах усыхання.

АПЕРАЦЫЯ «ЛІКВІДАЦЫЯ» ДЛЯ ІНВАЗІЙНЫХ РАСЛІН

Баршчэўнік Сасноўскага, сумнік канадскі, эхінацысцис лопасцевы — кожнае лета ідзе барацьба з гэтымі і іншымі інвазійнымі раслінамі. **Алег МАСЛОЎСКІ, загадчык сектара кадастру раслиннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН, кандыдат біялагічных навук,** расказаў аб асноўных кірунках барацьбы з інвазійнымі відамі раслін. Перш за ўсё, складзены прагноз экспансіі найбольш небяспечных з іх да 2025 года на тэрыторыі Беларусі па шчыльнасці займаемай плошчы на 100 тысяч гектараў. Найбольшую небяспеку ўяўляюць гіганцкі баршчэўнік, інвазійныя сумнікі і эхінацысцис лопасцевы.

Вучоны нагадаў, што Мінпрыроды з 2008 года вядзе планамерную работу па барацьбе з найбольш небяспечнымі інвазійнымі відамі раслін і ў першую чаргу з баршчэўнікам Сасноўскага. Практычныя мерапрыемствы па знішчэнні гэтага агрэсара

Апрацоўка высечкі інсектыцыдамі.

пачаліся ў 2010 годзе. Цяпер рэалізуецца стратэгія барацьбы з інвазійнымі відамі дзікарослых раслін на 2017–2025 гады, адобраная Мінпрыроды. Асноўная мэта стратэгіі, як растлумачыў Алег Маслоўскі, — поўная ліквідацыя месцаў росту баршчэўніка ў Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцях і ў Мінску і значнае скарачэнне месцаў яго росту ў Віцебскай (на 30 %) і Мінскай (на 50 %) абласцях.

«Калі не змагацца з інвазійнымі відамі раслін, то іх плошча штогод будзе павялічвацца на 10-15 %», — перасцярог навуковец. А як змагацца з непажаданымі прышэльцамі, падрабязна сказана ў «Патрабаванні да правядзення работ па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін (баршчэўніка Сасноўскага, сумніка канадскага, эхінацысціса лопасцевага і іншых) рознымі метадамі». Гэта адзін з раздзелаў Тэхнічнага кодэкса ўстаноўленай практыкі «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Раслінны свет».

Гаворачы аб стратэгіі барацьбы з інвазійнымі раслінамі, перш за ўсё маецца на ўвазе поўная інвентарызацыя, карціраванне і пашпартызацыя тэрыторый, дзе яны растуць. Затым праводзяцца аналіз атрыманых даных і распрацоўка метадаў барацьбы і планаў практычных мерапрыемстваў для кожнага адміністрацыйнага раёна і ўласніка ці арандатара зямель з улікам спецыфікі кожнай папуляцыі.

Як паясніў Алег Маслоўскі, для рэгулявання распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін у нашай краіне ўжываюцца наступныя метады: выдаленне кветканосаў; ручное знішчэнне раслін; ручное і механічнае скошванне; апрацоўка гербіцыдамі; узворванне; засеў травасумесямі; пасадка раслін; выпас жывёлы; выкарыстанне святлонепранікальных покрыўных матэрыялаў; зняцце кары з дрэвавых інвазійных раслін. Цікава, што замежныя эксперты самым эфектыўным спосабам барацьбы з інвазійнымі раслінамі прызнаюць выпас жывёлы, у прыватнасці авечак.

Вельмі важна, падкрэсліў вучоны, каб усе рэкамендацыі выконваліся ўдумліва і максімальна дакладна. Толькі тады можна дасягнуць станоўчага выніку, таму ў гэтым вялікая роля тэрытарыяльных структур Мінпрыроды як кантралюючых органаў.

Трэба разумець, што неабходна весці прафілактычную работу па недапушчэнні распаўсюджвання новых інвазій, у першую чаргу з боку памежных тэрыторый суседніх краін. «Для гэтых мэт у Нацыянальнай акадэміі навук з 2019 года пачаў стварацца спецыялізаваны цэнтр, які будзе абагульняць наяўную інфармацыю і праводзіць адпаведныя даследаванні», — рэзюмаваў Алег Маслоўскі.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Экакультура

Што рабіць з адходамі

Камунальныя — перапрацоўваць, небяспечныя — абясшкоджваць

Стварэнне эфектыўнай сістэмы абыходжання з адходамі, памяншэнне аб'ёмаў іх утварэння, максімальнае выкарыстанне смецця, абмежаванне выкарыстання пластыку і ўкараненне вытворчасцяў па біяраскладальнай упакоўцы. Такія мэты, што ставіць перад сабой Беларусь на найбліжэйшыя гады, агучваліся за круглым сталом «Удасканаленне сістэмы абыходжання з адходамі» ў межах экафоруму. Падчас перапрыемства айчынныя і замежныя эксперты падзяліліся не толькі тэхналогіямі, але і напрацоўкамі нарматыўна-прававой базы ў сферы абясшкоджвання і выкарыстання адходаў.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

БІЯРАСКЛАДАЛЬНАЯ ЎПАКОЎКА І ХАРЧОВЫЯ РЭШТКІ

Асаблівая ўвага ў краіне ўдзяляецца тэхналогіям па абясшкоджванні небяспечных адходаў і перапрацоўцы камунальных. А таксама вопыту абыходжання з непрыдатнымі пестыцыдамі, якіх у нас ужо назапасілася больш як 10 тысяч тон, і абсталяваннем, што ўтрымлівае ПХБ, якога ўтворана каля трох тысяч тон, абазначыў **Аляксандр КОРБУТ, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— У краіне праводзіцца пастаянная работа па ўдасканаленні заканадаўства і выкананні плана па змяншэнні выкарыстання пластыкавай упакоўкі і пераходу да экалагічна бяспечнай. Абмяркоўваюцца пытанні стварэння вытворчасці біяраскладальных відаў упакоўкі, у тым ліку з прыцягненнем прыватных кампаній і інвестараў.

Распрацоўка біяраскладальных матэрыялаў добра суадносіцца з тым, што ў Беларусі ідзе актыўная работа па стварэнні сістэмы збору раслінных адходаў і размяшчэнні на палігонах пляцовак для іх кампасціравання. Пра неабходнасць асобнага збору арганічных адходаў, у прыватнасці харчовых, гаварыла Ірына Вага, вучоны сакратар Інстытута ЖКГ. Яна нагадала, што забруджаныя рэшткамі ежы і арганічнага смецця адходы, нават адсарціраваныя, значна менш карысныя для другаснага выкарыстання і больш дарагія пры падрыхтоўцы да перапрацоўкі.

Валерый Ганчароў, дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН, прадставіў тэхналогію вытворчасці біяраскладальных палімераў на аснове прыроднай сыравіны (малочнай кіслаты).

— Галоўнае — не паўтарыць памылкі і не стварыць палімер, які за кошт дабавак будзе раскладацца, скажам, не 400 гадоў, а год, аднак на выніку гэтак жа ўплываць на асяроддзе, як і звычайны, бо канчатковым прадуктам яго распаду стане той жа мікрапластык. Пры гэтым варта памятаць, што біяраскладальная тара будзе патрабаваць асобнай сістэмы збору і абарачэння, — заўважыла **Вольга САЗОНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды.**

ПХБ-АБСТАЛЯВАННЕ І ПЕСТЫЦЫДЫ

За круглым сталом падзяліліся вопытам абясшкоджвання адходаў і замежныя спецыялісты. Грэгары Хамон з французскай кампаніі TREDI, якая спецыялізуецца на перапрацоўцы абсталявання з ПХБ, расказаў пра два магчымыя спосабы. Першы — калі кандэнсатар дробніцца і спальваецца цалкам. Другі — калі з трансфарматара зліваецца і знішчаецца масла (антыэлектрычная вадкасць), а сам трансфарматар прамываецца і выкарыстоўваецца далей. Не менш карысным падаецца і вопыт славацкай кампаніі ROVAMI па выкарыстанні адпрацаванага электроннага абсталявання і іншых небяспечных адходаў, пра што паведаміў начальнік яе экалагічнага ўпраўлення Уладзімір Радух. Падзялілася польскім вопытам бяспечнага знішчэння пестыцыдаў Дзіяна Паруб з кампаніі Geocoma.

Фота minsknews.by.

— У рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Беларусі ствараецца аб'ект па абясшкоджванні небяспечных адходаў на базе комплексу па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці. Так што нам было вельмі цікава даведацца, як такая работа арганізавана за мяжой, — акрэсліла Вольга Сазонава.

У Беларусі плануецца максімальна ўцягваць адходы ў грамадзянскі абарот з акцэнтам менавіта на камунальнае смецце. Узровень выкарыстання адходаў вытворчасці без уліку буйнатанажных у краіне складае звыш 80 %, а цвёрдых камунальных — толькі 27 %, адзначыў Аляксандр Корбут:

— На прадпрыемствах першапачаткова, згодна з заканадаўствам, арганізаваны раздзельны збор адходаў, якія арганізацыі абавязаны перадаваць на выкарыстанне і абясшкоджванне. Пры гэтым пералік прамысловых адходаў большы, чым камунальных. Калі ў прадпрыемства ёсць від адходаў, які ў Беларусі можна перапрацаваць, яно ніколі не атрымае дазволу на яго захаванне. На сайце Мінпрыроды змешчаны рэестр аб'ектаў па выкарыстанні адходаў, і любы суб'ект гаспадарання можа скарыстацца ім, каб вызначыць парадак абыходжання з адходамі, якія ў яго з'яўляюцца.

За мяжой да раздзельнага збору таксама ішлі доўга, сведчылі спецыялісты. Напрыклад, прадстаўнік славенскай кампаніі расказаў, як у іх рэалізаваны вакуумныя сістэмы збору смецця, якія знаходзяцца пад зямлёй, ды заземленыя кантэйнеры. Айчынныя эксперты, у сваю чаргу, упэўненыя, што ў Беларусі неўзабаве таксама ўкараняцца новыя тэхналогіі па абыходжанні з адходамі з выкарыстаннем міжнароднага вопыту.

Ірына СІДАРОК.

Экалогія і закон

ДАЧНАЕ СМЕЦЦЕ: НОВЫЯ ПРАВІЛЫ АБЫХОДЖАННЯ

Выплата штрафу не вызваляе ад арганізацыі месцаў збору адходаў

З 1 верасня мінулага года дзейнічаюць новыя правілы абыходжання з камунальнымі адходамі. Навацыі ў тым ліку датычацца і садаводчых таварыстваў. Колькі павінна быць кантэйнераў для смецця ў садаводчым таварыстве, каго і як пакараюць, калі не будзе ёмістасцяў для збору другасных матэрыяльных рэсурсаў — пра гэта і не толькі расказаў Віктар ПАДНЯСЕНСКІ, начальнік аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— З уступленнем у сілу Тэхнічнага кодэкса ўстаноўленай практыкі ТКП 17.11-08-2020 «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Адходы. Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі» і ў адпаведнасці з нормамі Закона «Аб абыходжанні з адходамі» садаводчыя таварыствы ўключаны ў агульныя (тэрытарыяльныя) схемы абыходжання з камунальнымі адходамі. Прасцей кажучы, усю дакументацыю павінен распрацаваць і зацвердзіць райвыканкам і ўзгадніць з тэрытарыяльным органам Мінпрыроды і дзяржаўным органам санітарнага нагляду, — тлумачыць Віктар Паднясенскі. — У схеме абавязкова ўказваецца: колькі павінна быць кантэйнерных пляцовак, колькі кантэйнераў і якіх, перыяд вывазу адходаў.

Што трэба ведаць дачнікам і да чаго ім рыхтавацца? У садаводчых таварыствах, дачных кааператывах падлягаюць раздзельнаму збору другасныя матэрыяльныя рэсурсы, адходы расліннасці, буйнагабарытныя адходы. На кожныя 70 і менш участкаў павінна быць абсталявана адна кантэйнерная пляцоўка, пры гэтым на кожныя 30 і менш участкаў устанаўліваецца адзін кантэйнер для змешаных камунальных адходаў. У кожным таварыстве або кааператыве размяшчаецца не менш за адзін кантэйнер для збору кожнага віду ДМР. Дапускаецца арганізацыя часовага захоўвання камунальных адходаў на зямельных участках членаў таварыства пры ўмове планавага вываду адходаў. Для збору раслінных адходаў пры наяўнасці дамовы з арганізацыяй, якая ажыццяўляе кампаставанне ці іншае выкарыстанне такіх адходаў, ствараецца спецыяльная пляцоўка, на якой устанаўліваецца кантэйнер вялікай ёмістасці. Для збору буйнагабарытных і будаўнічых адходаў выкарыстоўваюцца спецыяльныя кантэйнеры або абсталяваныя пляцоўкі. Гэта — кароткі пералік таго, што трэба ведаць дачніку. Дадзім яшчэ, што кантэйнерныя пляцоўкі павінны быць на адлегласці, не меншай за

Садаводчае таварыства «Станіца» — так выглядала пляцоўка да візіту супрацоўнікаў тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды.

20 метраў ад вокнаў садовых дамоў. А вось да чаго трэба рыхтавацца, дык да таго, што ўсё гэта ўстанаўліваецца за кошт таварыства/кааператыва, і без мэтавых узносаў мала ў каго атрымаецца ўсё ўладкаваць.

Па словах Віктара Паднясенскага, «нават вельмі далёка ад сталіцы» ёсць таварыствы, дзе ўжо даўно наладжаны раздзельны збор ДМР, маецца дастатковая колькасць пляцовак і кантэйнераў.

— Што датычыцца ўсіх астатніх, то перш за ўсё спецыялісты раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзяць вялікую тлумачальную работу са старшынямі праўленняў садаводчых таварыстваў, непасрэдна з самімі дачнікамі. Адначасова выдаюцца рэкамендацыі, прызначаюцца адэкватныя тэрміны, да якіх трэба ліквідаваць заўвагі, — расказвае спецыяліст. — Пакуль рана казаць пра нейкія вынікі за гэты год, таму што дачны сезон з-за халаднаватага мая толькі пачынаецца. Але практыка такая, што калі прадпісанне не выконваецца, на старшыню ці садаводчае таварыства накладаецца штраф. За парушэнне парадку абыходжання з адходамі (арт. 16.44, ч. 3 КаАП) на юрыдычную асобу накладаецца штраф да 1000 базавых велічынь. На дадзены момант гэта 29 000 рублёў. За гэтыя грошы можна купіць 50 вулічных кантэйнераў для збору цвёрдых камунальных адходаў.

Гэта вельмі важная рэмарка, таму што выплата штрафу не вызваляе ад арганізацыі месцаў збору адходаў (у тым ліку ДМР), таму эканамічна выгадна адразу купіць кантэйнеры і ўладкаваць пляцоўкі.

Яшчэ адна вострая дачная праблема — несанкцыянаваныя звалкі смецця, забруджванне тэрыторый вакол садаводчых таварыстваў.

Тое ж месца пасля выканання прадпісання.

— Калі ёсць доказы, а гэта факт фота- або відэафіксацыі, што дачнік выкінуў, напрыклад, на сельгасугоддзі тачку смецця, то да адказнасці будзе прыцягнута непасрэдна вінаватая асоба. Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях ацэньвае такія дзеянні грамадзяніна на суму штрафу да 30 БВ, — кажа Віктар Паднясенскі. — Калі ж у лесе мы бачым выкінутыя невядома кім пакеты са смеццем, то вінаватым лічыцца землекарыстальнік, гэта значыць лясніцтва, калі яно такое дапусціла на сваёй тэрыторыі, не прыняўшы адпаведных мер, у тым ліку па ўборцы адходаў. У такім выпадку штраф складае да 1000 БВ (у выпадку прыцягнення да адказнасці юрыдычнай асобы). Таму супрацоўнікі лясніцтваў і сочаць, каб сусэдзі-дачнікі не засмечвалі лес. Бывае, што ў самім садаводчым таварыстве ёсць несанкцыянаваная звалка. У залежнасці ад розных нюансаў, у такіх выпадках кароча ў адміністрацыйным парадку старшыня праўлення або само таварыства.

Спецыялісты аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама ўсіх раённых інспекцый пастаянна выязджаюць з мэтай правядзення маніторынгу у сельскія населеныя пункты, садаводчыя таварыствы і гаражныя кааператывы. Красамоўней за ўсё пра тое, як выконваецца схема абыходжання з адходамі, кажуць лічбы. Летась у вёсках, на лецішчах і ў гаражных кааператывах было праведзена 982 кантрольныя мерапрыемствы. Выяўлены 894 парушэнні, выдадзена 858 пунктаў рэкамендацый, 51 пункт прадпісанняў, прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці 80 вінаватых асоб, якія, аплаціўшы штрафы, папоўнілі бюджэт на 24 тысячы рублёў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота Мінскага абласнога камітэта ПРіАНА.

Правила проведения Рекламной игры

«ЗАРЯДИСЬ НА ЛЕТНИЙ ДВИЖ с «Гиппо» и «Белмаркет»!»

Настоящие правила проведения Рекламной игры **«Зарядись на летний движ с «Гиппо» и «Белмаркет»!»** (далее – Правила), направленной на стимулирование реализации продукции, указанной в п. 1.7 Правил, на территории, указанной в п. 1.3. Правил, разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры **«Зарядись на летний движ с «Гиппо» и «Белмаркет»!»** (далее – Рекламная игра).

1. Общие положения:

1.1. **Организатор Рекламной игры:** белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью (далее – «Организатор») с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП101132766. Электронный адрес: igra@primary-jwt.by.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является **Товарищество с ограниченной ответственностью «Progression CA» («Прогрэшен Си Эй»),** 050044, Республика Казахстан, БИН 080140009635, Медеуский район, город Алматы, улица Сызганова, дом № 1 (далее – «Заинтересованное лицо»).

1.2. **Наименование Рекламной игры: «Зарядись на летний движ с «Гиппо» и «Белмаркет»!».**

1.3. **Территория проведения Рекламной игры:** магазины торговых сетей «ГИППО» и «Белмаркет», расположенные на территории Республики Беларусь.

1.4. **Срок начала и окончания Рекламной игры**, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 21.06.2021 г. по 06.08.2021 г.

1.5. **Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры:** с 21 июня 2021 г. по 18 июля 2021 г. включительно.

1.6. **Состав комиссии по проведению Рекламной игры** (далее – Комиссия):

Председатель комиссии:

• Куянцев Игорь Юрьевич, заместитель директора СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

Члены комиссии:

• Шиманко Анастасия Александровна, ведущий специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Абрамович Татьяна Владимировна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Беляев Никита Юрьевич, специалист по медиапланированию Иностранного унитарного предприятия «Медиахауз»;

• Головач Светлана Александровна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО.

1.7. **Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (по тексту Правил – Игровой продукт):

• Шоколадный батончик Twix, масса нетто 55 граммов;
• Шоколадный батончик Snickers, масса нетто 50,5 грамма;
• Шоколадный батончик MARS, масса нетто 50 граммов;
• Шоколадный батончик Snickers Crisp, масса нетто 40 граммов;
• Шоколадный батончик Bounty, масса нетто 55 граммов.

2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:

2.1. К участию в Рекламной игре допускаются достигшие возраста 14 лет физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь (имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь).

2.2. Участником Рекламной игры не может быть член комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

2.3. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

2.4. Для участия в Рекламной игре необходимо в период времени с 21 июня 2021 г. по 18 июля 2021 г. (включительно) совершить следующие действия:

2.4.1. Зарегистрироваться на интернет-сайте www.bars-moments.by (далее – «Сайт») путем регистрации личного кабинета, подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре путем проставления галочки в специальном окне на Сайте и достоверно заполнить свои Персональные данные, а именно:

- Фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно при наличии);
- Адрес фактического проживания Участника: населенный пункт (обязательно), улица (обязательно при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно при наличии);
- Адрес электронной почты (обязательно);
- Личный номер мобильного телефона оператора сотовой связи Республики Беларусь в международном формате, услугами которого пользуется Участник (МТС, А1, Life:)) (обязательно), с указанием оператора сотовой связи А1, МТС, life:).

Регистрация на Сайте требуется один раз в течение Рекламной игры.

2.4.2. Приобрести в магазинах торговой сети «ГИППО» либо «Белмаркет», расположенных на территории Республики Беларусь, два и более любых игровых продукта (из указанных в п. 1.7. правил) в одном чеке.

При этом за каждые 2 игровых продукта, приобретенных в одном чеке, Участнику присваивается по одному уникальному цифровому коду, которые отражаются в дополнительном чеке, который печатается после основного чека и выдается при совершении покупки.

Уникальный цифровой код в дополнительном чеке торговой сети «ГИППО» состоит из 13 цифр, присваивается случайным образом и начинается с цифр 210056 (2100560000001, 2100560000002, 2100560000003, 2100560000004 и т. д.).

Уникальный цифровой код в дополнительном чеке торговой сети «Белмаркет» состоит из 13 цифр, присваивается случайным образом и начинается с цифр 210057 (2100570000001, 2100570000002, 2100570000003, 2100570000004 и т. д.).

2.4.3. Зарегистрировать в личном кабинете Участника на Сайте уникальный цифровой код, указанный согласно п. 2.4.2. Правил в дополнительном чеке. После осуществления регистрации уникального цифрового кода на Сайте код автоматически отображается в личном кабинете Участника. Уникальный цифровой код считается зарегистрированным на Сайте в момент его отображения в личном кабинете Участника.

2.5. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки Игрового продукта и выполнения иных требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

3. Состав и размер призового фонда и источники его формирования:

3.1. Призовой фонд Рекламной игры формируется Организатором в размере 5 697,66 (пять тысяч шестьсот девяносто семь) белорусских рублей и 66 копеек. Источником формирования призового фонда являются имущество и денежные средства Организатора, а также имущество Заинтересованного лица.

3.2. Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы (выигрыши), перечисленные ниже в Таблице № 1.

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры:

	Наименование призов	Кол-во, шт.	Цена за 1 единицу, бел. руб.	Всего, бел. руб.
	Еженедельные призы:			
1	Подписка Яндекс Плюс (срок действия 1 месяц, срок активации не позднее 31.12.2021 г.), стоимостью 6,79 белорусских рублей. Далее – Еженедельный приз № 1	200	6,79	1 358,00
2	Денежный приз в сумме 100 (сто) белорусских рублей. Далее – Еженедельный приз № 2	8	100,00	800,00
	Главный приз:			
3	Смартфон Apple iPhone 12 128GB / MGJE3 (синий) стоимостью 3 099,00 белорусских рублей, а также денежные средства в сумме 440,66 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз	1	3 539,66	3 539,66

4. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:

4.1. Розыгрыши призов проводятся в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2.

4.2. Розыгрыши призов проводятся следующим образом:

4.2.1. Розыгрыши Еженедельных призов проводятся согласно Таблице 2, Таблице 3 и Таблице 4 среди Участников, которые зарегистрировали уникальные цифровые коды на Сайте в соответствующий период времени.

Таблица 2. Розыгрыши Еженедельных призов № 1 среди Участников:

№	Дата и время розыгрыша:	Розыгрыши проводятся среди всех Участников, которые зарегистрировали уникальные цифровые коды на Сайте в следующий период времени:
1	01 июля 2021 г. в 15:00	с 00:00:00 21 июня по 23:59:59 27 июня 2021 г.
2	08 июля 2021 г. в 15:00	с 00:00:00 28 июня по 23:59:59 04 июля 2021 г.
3	15 июля 2021 г. в 15:00	с 00:00:00 05 июля по 23:59:59 11 июля 2021 г.
4	22 июля 2021 г. в 15:00	с 00:00:00 12 июля по 23:59:59 18 июля 2021 г.

В каждом розыгрыше разыгрывается по пятьдесят Еженедельных призов № 1.

Таблица 3. Розыгрыши Еженедельных призов № 2 среди Участников, которые в соответствии с правилами приобрели игровой продукт в торговой сети «ГИППО»:

№	Дата и время розыгрыша:	Розыгрыши проводятся среди Участников, которые в соответствии с правилами приобрели игровой продукт в торговой сети «ГИППО» и зарегистрировали уникальные цифровые коды на Сайте в следующий период времени:
1	01 июля 2021 г. в 16:00	с 00:00:00 21 июня по 23:59:59 27 июня 2021 г.
2	08 июля 2021 г. в 16:00	с 00:00:00 28 июня по 23:59:59 04 июля 2021 г.
3	15 июля 2021 г. в 16:00	с 00:00:00 05 июля по 23:59:59 11 июля 2021 г.
4	22 июля 2021 г. в 16:00	с 00:00:00 12 июля по 23:59:59 18 июля 2021 г.

В каждом розыгрыше разыгрывается по одному Еженедельному призу № 2.

Таблица 4. Розыгрыши Еженедельных призов № 2 среди Участников, которые соответствии с правилами приобрели игровой продукт в торговой сети «Белмаркет»:

№	Дата и время розыгрыша:	Розыгрыши проводятся среди Участников, которые соответствии с правилами приобрели игровой продукт в торговой сети «Белмаркет» и зарегистрировали уникальные цифровые коды на Сайте в следующий период времени:
1	01 июля 2021 г. в 16:10	с 00:00:00 21 июня по 23:59:59 27 июня 2021 г.
2	08 июля 2021 г. в 16:10	с 00:00:00 28 июня по 23:59:59 04 июля 2021 г.
3	15 июля 2021 г. в 16:10	с 00:00:00 05 июля по 23:59:59 11 июля 2021 г.
4	22 июля 2021 г. в 16:10	с 00:00:00 12 июля по 23:59:59 18 июля 2021 г.

В каждом розыгрыше разыгрывается по одному Еженедельному призу № 2.

Каждый из призов разыгрывается отдельно в указанной выше последовательности.

4.2.2. Розыгрыш Главного приза проводится 22 июля 2021 года в 16:30 среди всех Участников, которые приобрели соответствующий игровой продукт и выполнили иные условия участия в Рекламной игре в период времени с 21.06.2021 г. по 18.07.2021 г. включительно.

4.3. До начала каждого розыгрыша Комиссия составляет списки Участников, имеющих право участвовать в соответствующем розыгрыше, с указанием Порядкового номера регистрации, фамилии, имени, отчества Участников, уникального цифрового кода, а также даты и времени регистрации уникального цифрового кода на Сайте.

Порядковый номер регистрации присваивается каждой строке в списке Участников в хронологическом порядке исходя из даты и времени регистрации уникального цифрового кода на Сайте. В случае если у Участников совпадает дата и время регистрации уникального цифрового кода на Сайте, присвоение Порядковых номеров регистрации совершается по фамилии, имени и отчеству, отсортированным в алфавитном порядке. Порядковые номера регистрации в списке Участников имеют одинаковую разрядность.

4.4. Для каждого розыгрыша призов Организатором используются лототрон и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9. Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Определение Победителей производится по Порядковым номерам регистрации.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Порядкового номера регистрации в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего Порядкового номера регистрации из списка Участников. Шары перемешиваются. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

Далее аналогичным образом последовательно по одному определяются и фиксируются в протоколе второй и все последующие разряды выигрышного порядкового номера.

Участник, на чей Порядковый номер регистрации в списке Участников приходится сформированный выигрышный номер, является Победителем, имеющим право на получение соответствующего приза.

Таким образом определяются Победители всех розыгрышей.

При розыгрыше Главного приза в аналогичном порядке определяется один Резервный Победитель, который имеет право на получение Главного приза в случаях, предусмотренных в п. 6.3.1. Правил.

Каждый Участник может выиграть неограниченное количество Еженедельных призов № 1 и не более 1 (одного) Еженедельного приза № 2 за весь период проведения Рекламной игры. В случае если в результате последующих розыгрышей Еженедельного приза № 2 на данного Участника (Победителя, ранее выигравшего Еженедельный приз № 2 Рекламной игры) приходится новый выигрыш, то данному Участнику второй выигрыш не выдается, а для определения Участника, имеющего право на получение этого выигрыша, проводится повторный розыгрыш в порядке, предусмотренном п. 4.4. Правил.

5. Срок и способ информирования Победителей:

5.1. Победители извещаются о выигрыше посредством отправки сообщения на адрес электронной почты Участника, указанный им при регистрации согласно п. 2.4.1. Правил, в срок не позднее 24 июля 2021 года. Также Организатор оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом: телефонным звонком, почтовым отправлением и др.

6. Место, порядок и срок выдачи выигрышей:

6.1. Еженедельные призы № 1 выдаются в срок не позднее 06 августа 2021 г. путем направления соответствующих Подписок Яндекс Плюс в виде буквенно-числовых кодов с адреса электронной почты Организатора igra@primary-jwt.by на адрес электронной почты Победителя, указанный им при регистрации на Сайте.

6.2. Для получения Еженедельного приза № 2 Победителю необходимо не позднее 05 августа 2021 г. явиться в офис Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2 (режим работы Организатора по выдаче призов: рабочие дни – с 10.00 до 17.00 часов, суббота 24 июля 2021 г. – с 10.00 до 13.00 часов), предварительно связавшись с Организатором по телефону + 375 29 513 46 94 (звонок платный в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник), предоставить документ, подтверждающий личность (паспорт или вид на жительство), а также Договор, подтверждающий наличие у Победителя счета в белорусских рублях, заключенный Победителем с одним из банков Республики Беларусь (при наличии такового), оформить (подписать) документы, связанные с выдачей приза.

По просьбе Победителя, выраженной в его электронном письме, отправленном на электронный адрес Организатора (igra@primary-jwt.by) в срок не позднее 30 июля 2021 г., к которому должны быть прикреплены разборчиво сканированные или сфотографированные копии паспорта или вида на жительство Победителя, Договора, подтверждающего наличие у Победителя счета в белорусских рублях, заключенного Победителем с одним из банков Республики Беларусь (при наличии такового), приз может быть выдан Победителю без его личной явки за получением приза в офис Организатора.

После выполнения указанных выше формальностей Организатор выдает приз путем перечисления причитающихся к выплате Победителю денежных средств в безналичном порядке на счет соответствующего Победителя в срок не позднее 06 августа 2021 г. В случае отсутствия у Победителя Договора на банковский счет Главный приз выдается Победителю в этот же срок путем перечисления причитающихся к выплате денежных средств в безналичном порядке почтовым переводом.

Перечисление (перевод) денежных средств Победителю производится за счет Организатора.

6.3. Для получения Главного приза Победителю (основному Победителю) необходимо не позднее 29 июля 2021 г. явиться в офис Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2 (режим работы Организатора по выдаче призов: рабочие дни – с 10.00 до 17.00 часов, суббота 24 июля 2021 г. – с 10.00 до 13.00 часов), предварительно связавшись с Организатором по телефону + 375 29 513 46 94 (звонок платный в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник), предоставить документ, удостоверяющий личность. При выдаче Организатором Победителю в день обращения после оформления документов, связанных с выдачей приза.

6.3.1. Резервный Победитель имеет право на получение Главного приза в случае, если Победителю (основному Победителю) Главный приз не был выдан в установленном порядке. Резервный Победитель извещается о выигрыше в порядке, предусмотренном п. 5.1. Правил, в срок не позднее 30 июля 2021 г., после чего Главный приз выдается ему в срок не позднее 06 августа 2021 г. в порядке, предусмотренном п. 6.3. Правил.

6.4. При невыполнении Победителями условий и сроков получения призов, иных условий участия в игре, предусмотренных в настоящих Правилах, Победитель может быть лишен права на получение соответствующего приза.

6.5. Организатор при выдаче Главного приза признается налоговым агентом и удерживает из денежной части приза подоходный налог, причитающийся к уплате Победителем в связи с получением приза.

6.6. Организатор не оплачивает Победителям расходы, связанные с проездом к месту получения приза или в офис Организатора.

6.7. В случае если Победитель не может явиться в офис Организатора для совершения предусмотренных Правилами процедур лично, соответствующие действия может совершить от его имени его доверенное лицо по предъявлении документа, удостоверяющего личность, и надлежащим образом заверенной доверенности.

6.8. Получение призов несовершеннолетними Победителями осуществляется с письменного согласия законных представителей несовершеннолетних, чьи полномочия должны быть надлежащим образом подтверждены перед Организатором.

6.9. Призы не подлежат выдаче Участнику иначе как в порядке, предусмотренном Правилами. В случае отказа Участника от получения приза, невыполнения Участником требований настоящих Правил или неполучения им приза в установленные сроки и в установленном порядке, Участник теряет право на получение приза, и причитающийся Победителю приз остается у Организатора.

7. Прочие условия:

7.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

7.2. Результаты проведения Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» не позднее 05 августа 2021 г.

7.3. Информацию о Правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте www.bars-moments.by, а также по телефону горячей линии (телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры) +375 17 239 06 68 с 10.00 до 18.00 часов ежедневно без выходных. Звонок платный в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник.

7.4. Организатор не несет ответственности за:

7.4.1. Ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры и за достоверность сведений и персональных данных, указанных Участниками при регистрации.

7.4.2. Невозможность связаться с Участником в случае недостоверности информации, предоставленной Участником.

7.4.3. Невыполнение (несвоевременное выполнение) Участниками обязанностей, связанных с участием в Рекламной игре и получением призов.

7.4.4. Неознакомление Участников с настоящими Правилами и условиями участия в Рекламной игре, а равно их неознакомление с результатами проведения Рекламной игры.

7.4.5. Неполучение (несвоевременное получение) от Участников документов и/или сведений, необходимых для получения призов.

7.4.6. За работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику) и операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

7.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору.

7.7. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

Свидетельство № 4008 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 4 июня 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

СПРАВА ДЛЯ алкаНАТА

Як пачуваюць сябе замежныя вайскоўцы ў Эстоніі?

У Эстоніі за парушэнне грамадскага парадку ў цягніку затрымалі шасцярых нецвярозых брытанскіх салдат. Аб гэтым паведаміла The Daily Mirror. Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Йыгева. Пасажыры паскардзіліся на шумныя паводзіны вайскоўцаў, якія, па словах відавочцаў, былі вельмі п'яныя і агрэсіўныя. Праваднікі паспрабавалі вырашыць праблему самастойна, аднак гэта не дапамагло, і давялося выклікаць паліцыю. У выніку салдат знялі з цягніка, затрымалі і перадалі ваеннай паліцыі НАТА. Эксперт Брус Джонс з лонданскай кампаніі Jane's, у сваю чаргу, палічыў, што да інцыдэнту могуць мець дачыненне... усюдыісныя «агенты расійскай разведкі» (хіба што алкаголь брытанскім вайскоўцам у рот заліваліся?). Прадстаўнік Міністэрства абароны Вялікабрытаніі адмовіўся паведамляць падрабязнасці інцыдэнту, спаслаўшыся на тое, што расследаванне працягваецца. Як паведамляюць СМІ, гэта далёка не першы скандал з удзелам салдат Паўночнаатлантычнага альянсу. Як пачуваюць сябе замежныя вайскоўцы ў Эстоніі?

МЕСЦІЧЫ З ДОМУ НЕ ВЫХОДЗЯЦЬ

Цяпер некалькі соцень брытанскіх вайскоўцаў знаходзяцца ў Эстоніі ў складзе баявой групы НАТА. У 2016 годзе ў рамках узмацнення перадавой прысутнасці на ўсходнім флангу Паўночнаатлантычны альянс размясціў чатыры шматнацыянальныя баявыя групы памерам да батальёна ў Эстоніі, Латвіі, Літве і Польшчы, склад якіх змяняецца на ратацыйнай аснове. Гэтыя падраздзяленні знаходзяцца пад камандаваннем Брытаніі, Канады, Германіі і ЗША. Цяпер на эстонскай тэрыторыі знаходзіцца першы батальён брытанскага Мерсійскага палка, які прыбыў туды ў сакавіку.

«Разборкі» ў цягніку — другі падобны інцыдэнт з удзелам прадстаўнікоў альянсу ў Эстоніі за апошні месяц. У сярэдзіне мая ў эстонскім мястэчку Тапа адбылася масавая бойка паміж вайскоўцамі НАТА і тутэйшымі жыхарамі. Кіраўнік мясцовай патрульнай паліцыі Тауна Лемпу апісаў сітуацыю наступным чынам: «Паміж замежнымі салдатамі, якія праходзяць службу ў Эстоніі, і мясцовымі мужчынамі ўзнікла непаразуменне. Зараз вядома, што салдаты размаўлялі з адной жанчынай, што было непрымальна для мясцовых мужчын. Калі прыехала паліцыя, у бакоў не было прэтэнзій адзін да аднаго, сітуацыя ўжо супакоілася. На той момант ніхто не паведаміў, каб хтосьці пацярпеў у бойцы, выкліканай непаразуменнем».

Прадстаўнік НАТА ў Эстоніі таксама заклікаў не згушчаць фарбы: «Цяпер было б недарэчна каментаваць дэталі таго, што адбылося». А вось мясцовы жыхар, які стаў сведкам бойкі, заявіў выданню «Virumaa Teataja»: «Я бачыў, як мясцовы жыхар і брытанскі салдат сварыліся адзін з адным у Тапа каля кафэ Pats, а пасля лаянка перарасла ў бойку. Яна перамясцілася ад кафэ Pats да крамы Grossi. На жаль, у бойку ўцягнулі і жанчыну, якую салдаты таксама білі. Усяго ў бойцы ўдзельнічалі тры жанчыны, дзве, відавочна, пайшлі абараняць сваю сяброўку ад салдат... Я таксама чуў, што за дзень да гэтага салдаты пабіліся паміж сабой побач з крамай Grossi. Шчыра кажучы, у Тапа больш нельга выходзіць паесці ў выхадныя дні, паколькі пасля абеду, у чатыры гадзіны дня, брытанскія салдаты ўжо моцна п'яныя і чапляюцца да мясцовых».

Камандуючы баявой групай НАТА ў Эстоніі палкоўнік Дын Кэмхэм заявіў, што да скаргаў месцічаў ставіцца «вельмі сур'ёзна» і з эстонскімі ўладамі наладжана ўзаемадзеянне, паведаміла err.ee. Але чамусьці каменціраваць канкрэтны інцыдэнт прадстаўнікі альянсу адмовіліся. У адрозненне ад іх дырэктар гімназіі ў Тапа Эльма Капельмаа не хаваў, што вучні неаднаразова расказвалі яму аб непрыстойных паводзінах салдат у горадзе. «Я адмаўляюся такое трываць. Няправільна, што нашы салдаты-саюзнікі так сябе паводзяць», — падкрэсліў дырэктар тапаскай гімназіі.

І гэта далёка не першы выпадак. У адным са SPA-цэнтраў Таліна 27-гадовы вайсковец сіл НАТА, дыслацыраваных у Эстоніі, зладзіў дэбош: напаў на наведвальнікаў і супрацоўнікаў. Прыбылі прадстаўнікі і «звычайнай», і ваеннай паліцыі, але парушальнік парадку прафесійна збег, хоць кажуць, што пазней ён нібыта усё ж прынёс прабачэнні SPA-салону.

ГАЗ СУПРАЦЬ ДЭБАШЫРАЎ

Калі прагледзець зводкі навін за апошнія гады, то інцыдэнты з вайскоўцамі НАТА на глебе ўжывання спіртнога адбываюцца рэгулярна. У чэрвені 2019-га ваенаслужачыя Каралеўскай марской пяхоты Вялікабрытаніі зладзілі на борце карабля п'яны дэбош падчас вучэнняў Baltic Protector у Балтыйскім моры. Паведамляў таблоід Daily Mail. У Сетцы таксама былі апублікаваны кадры з цырымоніі «прысвячэння» навабранцаў. На адным з кадраў быў заўважаны нецвярозы салдат з намаляваным на грудзях нацысцкай сімволікай. Пасля гэтага камандаванне марской пяхоты загадала вайскоўцам выдаліць усе матэрыялы з мерапрыемства і забараніла публікаваць іх у сацсетках. У выпадку парушэння загаду ім прыгразілі дысцыплінарнымі мерамі.

Годам раней тры афіцэры брытанскай арміі, якія знаходзіліся ў Латвіі ў складзе кантынгенту войскаў НАТА, учынілі бойку з рыжскімі паліцэйскімі, паведамляла газета The Sunday Times. Падчас бойкі вайскоўцы знаходзіліся ў нецвярозым стане. Адзін з іх служыў у 19-м Каралеўскім артылерыйскім палку, двое іншых — у 4-м Каралеўскім артылерыйскім палку. Каб утаймаваць дэбашыраў, праваахоўнікі былі вымушаны прымяніць пярцовы газ. Аднаго з афіцэраў затрымалі на некалькі гадзін, пасля чаго супрацоўнікі ваеннай паліцыі Латвіі і Канады даставілі ўсіх вайскоўцаў у іх вайсковыя часці.

У 2014 годзе, пасля вучэнняў Open Spirit у Латвіі, мэр Вентспілса Айварс Лембергс звярнуўся ажно да тагачаснага генсека НАТА Андэрса Фог Расмусена: «Маракі НАТА ў Вентспілсе паводзілі сябе па-свінску, — напісаў ён, — ігнаравалі законы Латвіі і правілы самакіравання. Напіўшыся, яны спраўлялі патрэбу ў грамадскіх месцах і на вітрыны, ванітавалі, публічна ўжывалі спіртное. Яны таксама зрывалі кветкі з кветнікаў, каб дарыць іх прастытуткам». Пасля гэтага Лембергса абвінавацілі ў... рабоце на Маскву. Ён, маўляў, ганіць гонар байцоў НАТА, якія «абараняюць Прыбалтыку ад акупацыі».

Вайскоўцы НАТА ў краінах Балтыі адчуваюць сябе гаспадарамі, што ўсё больш выклікае незадаволенасць у тутэйшых жыхароў. Замежныя салдаты заўсёды дастаўляюць месцічам вялікі дыскамфорт, заўважыў журналіст Антанас Тубеліс у інтэрнэт-выданні The Baltic Word. Вядомыя выпадкі п'янства, боек з мясцовым насельніцтвам, арыштаў паліцыяй, дарожна-транспартных здарэнняў, псавання маёмасці і нават апаганьвання дзяржаўнага сцяга. Падобныя здарэнні ў краінах Балтыі адбываюцца пастаянна, іх ужо дзясяткі.

Так, у лютым 2016 года п'яныя амерыканскія салдаты разграмілі аквапарк у літоўскім курортным горадзе Друскінінкай. У будынку спарткомплексу яны чапляліся да персаналу аквапарка і правакавалі супрацоўнікаў.

У лістападзе таго ж года брытанскія салдаты збілі мясцовых жыхароў Рыгі. У лютым 2017-га пяць п'яных чэшскіх салдат біліся ў Клайпедзе. У чэрвені чацвёра п'яных нямецкіх салдат збілі мясцовых у Ёнава, а праз месяц п'яныя галандскія салдаты ўчынілі бойку з-за рахунку ў рэстаране.

Вядомым скандалам з удзелам ваенных НАТА стала бойка, зладжаная нецвярозымі нямецкімі вайскоўцамі ў літоўскім горадзе Рукла. Апагеем «п'яных гісторый» стала апаганьванне дзяржаўнага сцяга Літвы. У красавіку 2016 года амерыканскія салдаты сарвалі сцяг Літоўскай Рэспублікі з будынка пракуратуры Клайпеды.

«Войскі НАТА сталі пастаяннай пагрозай для мірнага насельніцтва Латвіі, Літвы і Эстоніі. У іх невысокая дысцыпліна. П'яныя замежныя салдаты часта запалохваюць і зневажаюць мясцовых жыхароў. Вайсковыя манеўры парушаюць спакойнае жыццё дзяржаў», — рэзюмаваў Тубеліс.

Раней baltnews.lt пісаў пра метад набору вайскоўцаў у войска Літвы, які выклікае ў мясцовых жыхароў шмат сумненняў. Падыход да вярбоўкі па прынцыпе латарэі прыводзіць да з'яўлення ў арміі асоб са злачыннымі намерамі і схільнасцямі. Пачасціліся выпадкі супрацьпраўных дзеянняў, учыненых літоўскімі вайскоўцамі. У мінулым годзе ў краіне адзначаўся рэгулярны паўтор непрыемных інцыдэнтаў з удзелам вайскоўцаў.

Напрыклад, у кастрычніку 2020-га каля горада Юрбаркас быў затрыманы салдат літоўскага войска, які знаходзіўся за рулём у стане алкагольнага ап'янення. У снежні ў Шаўляі таксама быў затрыманы вайсковец, які падазраецца ў кіраванні нападпітку. Паведамлялася і аб выпадках дэзерцірства, якія траплялі пад расследаванне Галоўнага камісарыята паліцыі літоўскіх муніцыпалітэтаў.

БЕЗ АРКЕСТРА

Хапае праблем і ў эстонскім войску. Высветлілася, што адно з элітных падраздзяленняў Сіл абароны гэтай краіны складаецца з асоб, якія пакутуюць на алкагалізм. Эстонская газета Eesti Paevaleht у 2016-м апублікавала даныя магістарскай працы лейтэнанта Танэля Ратыстэ, у якой ён даследуе ўплыў спіртнога на боегатоўнасць. «Дзеючыя ваенныя Сілы абароны Эстоніі апынуліся ў цэнтры ўвагі з-за сумных падзей, у якіх меў месца алкаголь і яго ўжыванне. Прыкладамі нядаўнія будуць выкарыстанне зброі падчас свят і два самагубствы: у адным выпадку сур'ёзна пацярпеў дзеючы ваенны, а ў іншым байцу быў пастаўлены дыягназ «посттраўматычны стрэс», — заўважыў Танэль Ратыстэ ва ўступе да даследавання.

Лейтэнант Ратыстэ, які праходзіў службу ў скаўцкім батальёне — разведвальным злучэнні Сіл абароны Эстоніі (манеўранае злучэнне хуткага рэагавання, якое складаецца з вайскоўцаў, якія служаць па кантракце, і ўваходзіць у склад Першай пяхотнай брыгады), правёў апытанне сярод сваіх аднапалчан. Вынікі аказаліся несуцяшальнымі. З 327 апытаных 161 (49,3 %) прызнаўся ў злоўжыванні алкаголем звыш той нормы, якая лічыцца небяспечнай для здароўя, 14 байцоў лічаць сябе алкаголікамі.

Правёўшы дадатковае апытанне сярод таварышаў па службе, якія п'юць, даследчык высветліў, што 36 з іх пакутуюць на дэпрэсію і парушэнні сну, 23 прызналіся ў магчымай сацыяфобіі (апасенне знаходзіцца ў грамадстве і выконваць грамадскія дзеянні), 22 заявілі, што адчуваюць павышаную трывожнасць, а шасцёра пакутуюць на панічныя атакі.

Па сцвярджэнні Ратыстэ, ужыванне алкаголю сярод вайскоўцаў разведвальнага батальёна з'яўляецца сур'ёзнай праблемай, якая ў пэўнай ступені ўплывае на боегатоўнасць часці. І калі не звяртаць на яе ўвагу, то гэта можа прывесці да сур'ёзных праблем у будучыні.

Прыкладна ў той жа перыяд часу ўспыхнуў скандал вакол міннага тральшчыка «Сака» Сіл абароны Эстоніі. Пры вяртанні з баявога паходу ў Талін каманду сустрэлі мытнікі і пракуратура, якія дакладна ведалі, што і дзе шукаць. На борце тральшчыка былі выяўлены 56 скрынь цыгарэт і 1000 літраў спіртнога. Выяўленая кантрабанда прывяла да серыі адставак сярод эстонскага ваеннага кіраўніцтва.

Як заўважыў міністр здароўя і працы Танэль Кіік, «алкаголь паранейшаму адыгрывае занадта вялікую ролю ў нашым грамадстве. Нас занадта мала, каб страціць сотні жыццяў з-за злоўжывання алкаголем, калі мы выйдзем з пандэміі каранавіруса».

Цяжкай праблемай для Сіл абароны Эстоніі застаюцца нестатутныя ўзаемаадносіны. У войску развіліся так званыя зямляцтвы: там, дзе пераважаюць прызыўнікі-эстонцы, яны кааперыруюцца для здзекаў з рускамоўных таварышаў па службе. Тыя, у сваю чаргу, плацяць той жа манетай. З адпаведным запытам у 2019 годзе дэпутат парламента Эстоніі Марцін Хельмэ звяртаўся да міністра абароны краіны.

Тым часам стала вядома, што ў Эстоніі распусцілі адзіны ваенны аркестр. Аб гэтым абвясціў прэс-сакратар Сіл абароны Тааві Каротам. У інтэрв'ю парталу Delfi ён заявіў, што «скарачэнне пройдзе пры прыняцці мер эканоміі, прадугледжаных у новай стратэгіі». Па рашэнні камандуючага Сіламі абароны Эстоніі Марціна Херэма, на працягу 2021 года ў розных падраздзяленнях будзе скарочана 200 пасад з 5000, якія існуюць на сённяшні дзень. «Дзейная стратэгія дзяржаўнага бюджэту прадугледжвае скарачэнне выдаткаў. Паколькі такія патрабаванні былі прад'яўлены ў тым ліку і да Сіл абароны, мы вымушаны прыняць складанае рашэнне», — заўважыў Херэм. Апроч аркестра, у які ўваходзіў 41 чалавек, пад скарачэнне трапіла і служба ваенных капеланаў. Таксама звальненні закрануць рэферэнтаў, фінансістаў, юрыстаў і кадравікоў.

Аднак ёсць пазіцыі, якія застаюцца непахіснымі нават падчас рэжыму звышжорсткай эканоміі. Напрыклад, ваенныя выдаткі. Эстонія чакае, што ўсе краіны НАТА будуць выдзяляць на абарону не менш чым два працэнты свайго ВУП. Пра гэта заявіла пасол Эстоніі ў альянсе Кюліке Сіластэ-Элінг напярэдадні саміту альянсу ў Брусэлі. «Калектыўная абарона — найважнейшая задача НАТА», — заўважыла прэм'ер-міністр Эстоніі Кая Калас. Раскажыце гэта лепш месцічам з Тапа.

Пётр ДУНЬКО.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

У БЕЛАРУСІ СТВАРАЮЦЬ АНТЫКОВІДНЫ ІМУНАГЛАБУЛІН

Праект па атрыманні антыковіднага імунаглабуліну рэалізоўваецца ў РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. Пра гэта «Звяздзе» расказаў яго дырэктар Фёдар КАРПЕНКА

— У нас выпушчаны вопытныя серыі, адпрацавана вопытная тэхналогія. Зараз мы пачынаем даклінічныя даследаванні, і, спадзяюся, на працягу трох-чатырох месяцаў пяройдзем да клінічных выпрабаванняў.

Імунаглабуліны атрымліваюць з плазмы крыві і выкарыстоўваюць пры розных інфекцыйных захворваннях. Адпаведна, з антыковіднай плазмы мяркуецца атрымліваць імунаглабулін, які будзе дапамагаць у лячэнні каранавіруснай інфекцыі. Ён будзе выклікаць імунны адказ у арганізме, што дазволіць спраўляцца з інфекцыяй.

— Плазму дастаткова цяжка пераліваць, бо ёсць свае паказанні і супрацьпаказанні. Гэта працэдура для стацыянара. Атрыманне антыковіднага імунаглабуліну накіраванага дзеяння спрашчае дадзеную задачу, — кажа Фёдар Карпенка.

Што датычыцца самой антыковіднай плазмы, Фёдар Карпенка паведаміў, што з пачатку пандэміі донары выканалі каля васьмі тысяч данацый, было нарыхтавана пяць тон крыві. Цяпер у запасе яе каля 2,5 тоны. Сёлета патрэба ў антыковіднай плазме меншая.

— З пачатку года выканана каля 1,5 тысячы данацый, нарыхтавана 700 літраў плазмы. На цяперашні момант гэтага хапае. Нашы ўрачы навучыліся дастаткова эфектыўна лячыць COVID-19. Выкарыстанне

антыковіднай плазмы для пералівання — працаёмкая тэхналогія, таму ўсе ідуць па шляху выкарыстання не кампанентаў крыві, а лекавых прэпаратаў. Плазма застаецца запатрабаванай у больш цяжкіх выпадках, на пачатковых стадыях, — растлумачыў Фёдар Карпенка.

ШТО ВЫРАБЛЯЮЦЬ З ПЛАЗМЫ КРЫВІ?

Ён адзначыў, што з развіццём новых тэхналогій у медыцыне страты крыві пры планавых і экстранных аперацыях зменшыліся, таму цяпер патрабуецца менш донарскай крыві і яе кампанентаў. Аднак усё роўна ёсць аперацыі, дзе выкарыстоўваецца яе вялікая колькасць. Напрыклад, на трансплантацыю печані патрабуецца каля 30 доз эрытрацытаў, 20 доз плазмы, каля 20 доз крыапрэцыпітату. Адпаведна, такая колькасць донараў павінна здаць кроў. Пры стандартных аперацыях затраты больш сціплыя — ад двух да шасці доз розных кампанентаў донарскай крыві.

Разам з тым павялічваецца колькасць лекавых прэпаратаў, якія вырабляюцца з плазмы крыві. У адрозненне ад кампанентаў крыві, якія падбіраюцца ў залежнасці ад групы, лекавыя сродкі падыходзяць абсалютна ўсім. Напрыклад, лекавы прэпарат альбумін вырабляецца з плазмы і выкарыстоўваецца для аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з апёкамі, з парушэннем работы печані, падчас рэанімацыйнага лячэння.

— За апошнія гады ўжыванне плазмы знізілася на чвэрць, а вытворчасць альбуміну павялічылася на 25 %, — кажа Фёдар Карпенка.

Таксама з плазмы атрымліваюць згаданыя імунаглабуліны, фактары згусання крыві. Наша краіна адна з першых у свеце вырабіла плазму, якая ўзбагачана трамбацытамі. Яна выкарыстоўваецца не для пералівання, а для ўнутрысустаўнага ўвядзення пры астэаартрозах, у касметалогіі, пры спартыўных траўмах, для зажыўлення і рэгенерацыі тканак.

БЯЗВЫПЛАТНЫ — НЕ БЯСПЛАТНЫ

У хуткім часе ў парламенце будзе разгледжаны закон аб бязвыплатным донарстве. Мяркуецца паэтапны пераход, платныя данацыі па-ранейшаму часткова будуць захаваныя. Ды і бязвыплатныя данацыі прадугледжваюць поўную кампенсацыю расходаў, якія панёс чалавек.

— Прынцып бязвыплатнасці — гэта не бясплатна, — тлумачыць Фёдар Карпенка. — Гэта кампенсацыя затрат донара ў адпаведнасці з міжнароднымі прынцыпамі фінансавай нейтральнасці: чалавек не



Фота БелТА.

павінен панесці фінансавых страт, але і не павінен набыць фінансавых выгод. Усе краіны Еўропы, у тым ліку суседкі Беларусі, дзейнічаюць на прынцыпах бязвыплатнага донарства. Мы таксама плануем паступовы пераход да бязвыплатнага донарства, захоўваючы грашовыя кампенсацыйныя выплаты. Захоўваецца сярэдні заробак у дзень данацыі і вызваленне ад работы, прадугледжана грашовая кампенсацыя на харчаванне да і пасля данацыі, уводзіцца новая кампенсацыйная выплата на ўзмоцненае харчаванне паміж данацыямі, каб аднавіць жалеза і гемаглабін. Гэта дакладна пралічана ў межах навуковых і агульнасусветных стандартаў.

На сёння адна данацыя цэльнай крыві абыходзіцца бюджэту ў 100 долараў, плазмы — каля 150 долараў, трамбацытаў — каля 300. На службу крыві штогод траціцца ад 20 да 40 мільёнаў долараў.

— Гэта вялікі плюс, бо стандарты ў беларускай трансфузіялогіі максімальна высокія. І важна, што яны аднолькавыя ва ўсіх рэгіёнах, — падкрэслівае кіраўнік РНПЦ.

Новы законапраект прадугледжвае, што донар будзе ведаць, куды пойдзе яго кроў.

